

АПЕТЫТЫ «ДЗЯЦЕЙ ЦЬЮРЫНГА» ЧЫРВОНКА

«ДОЙЛІДЫ» СВАІХ ДОБРЫХ ЭМОЦЫЙ ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 САКАВІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 49 (29163)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр МІКЛАШЭВІЧ, старшыня Канстытуцыйнага суда:**

*«Канстытуцыйны суд пры рабоце над зменамі ў Канстытуцыю прааналізаваў палажэнні Асноўнага закона краіны з улікам зменлівых грамадскіх адносін і рэалій канстытуцыйнага будаўніцтва, больш чым 50 канстытуцый замежных краін. У выніку выпрацаваны пэўныя прапановы па ўдасканаленні. Мы прытрымліваліся таго, каб не парушыць прынцып стабільнага канстытуцыйнага развіцця. Трэба захаваць тыя канстытуцыйныя палажэнні, якія сапраўды паказалі, што на іх аснове дасягаюцца мір і спакой, развіваецца эканоміка, сацыяльная сфера. А ў цэлым — каб змены былі скіраваны на сацыяльны прагрэс, мадэрнізацыю грамадства і далейшае дынамічнае развіццё нашай краіны».*

# РОДНЫЯ ЛЮДЗІ



75 Вялікая Перамога

У Валянціны СТАЛБОВАЙ з гарадскога пасёлка Балбасава Аршанскага раёна былі два бацькі. Роднага, Яфіма Васільевіча, калі пачалася вайна, забралі на фронт. На той час мужчыну было трыццаць чатыры гады, у яго раслі ўжо трое дзетак. Валянціна бацьку не памятае, бо нарадзілася за тры дні да пачатку ліхалецця.

— У 1944 годзе, пасля вызвалення Беларусі, матуля атрымала паведамленне, што наш тата знік без вестак у баі пад Смаленскам, — расказвае Валянціна Яфімаўна. — З таго прызыву ў вёску Казекі на Аршаншчыне не вярнуўся дваццаць адзін мужчына...

Пасля вайны шасцігадовую Валянціну стаў гадаваць Сямён Сянько, ветэран, франтавік, які ўдзельнічаў і ў фінскай вайне, і ў разгроме мілітарысцкай Японіі.

— У 1947-м Сямён Пятровіч пазнаёміўся з нашай матуляй, прыйшоў да нас, замяніў нам бацьку. Потым у мяне з'явіліся яшчэ два маленькія браты і дзве сястрычкі, — з пяшчотай і павагай згадвае Валянціна свайго айчыма.

У яе кватэры вісяць партрэты двух салдат той вайны: Яфіма і Сямёна. Для яе абодва яны самыя родныя людзі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны будзе напісаны ў Беларусі.**
- У нашай краіне ствараецца дзяржадміністрацыя воднага транспарту.
- **Другі чалавек у свеце цалкам вылечыўся ад ВІЧ.**
- Усе ўстановы адукацыі Беларусі працуюць у штатным рэжыме.
- **Анлайн-рэсурс аб якасці тавараў і паслуг з'явіўся ў нашай краіне.**
- Вялікі тэатр пакажа прэм'еру дзіцячага спектакля «Кошчын дом».
- **Служба занятасці дапамагла амаль 60 % грамадзян, якія лечацца ад алка- і нарказалежнасці працаўладкавацца ў 2019 годзе.**

Адпачынак на вёсцы

# ЦІ ТРЭБА «СКАКАЦЬ» ВАКОЛ ТУРЫСТАЎ?

### Некаторыя гаспадары аграсядзіб нават не задумваюцца пра гэта

**Здавалася б, беларускі агратурызм актыўна развіваецца: калі ў 2006 годзе было зарэгістравана ўсяго 34 сядзібы, гатовых прыняць турыстаў, дык сёння гэта лічба вырасла да 2760. Летась паслугамі аграсядзіб скарысталася больш за паўмільёна чалавек. Беларусь прызналі адной з найлепшых у свеце ў галіне вясковага турызму і сюды нават пачалі прыязджаць па ідэі эксперты з іншых краін. Напрыклад, айчынны вопыт зацікавіў італьянцаў — у жніўні калі, дасць бог, каранавірус ужо не будзе пагрозай, на Валожыншчыне чакаюць дэлегацыю з Сардзініі (замежнікаў хвалюе, чым можа завабіць глыбінка, бо ў іх на тэрыторыях, якія знаходзяцца больш чым за 40 кіламетраў ад мора, турыстаў амаль не сустрэць). У маі ў Мінску плануецца правесці міжнародны форум, прысвечаны агаэкатурызму, на якім чакаюцца сотні ўдзельнікаў з розных краін (зноў жа, калі не перашкодзіць каранавірус).**

**Але гаспадары дамкоў на вёсцы звяртаюць увагу на пэўныя «трывожныя званочкі» ў сваёй сферы. Дык ці так у нас усё добра?**

СТАР. 4

Сацыяльны зрэз

# ВЯРТАННЕ ДА ЖЫЦЦЯ

### Як былыя наркаманы, алкаголікі, судзімыя мяняюць светапогляд і паводзіны ў цэнтры рэабілітацыі пад Маларытай

**Колькі ўжо сказана, напісана пра цяперашнюю навалу — наркотыкі, але кожная асобная гісторыя ўражвае па-новаму. Вось уявіце сабе: жыла ў Пінску звычайная, працавітая, добрая сям'я. Муж з жонкай гадавалі дваіх дзяцей, сын з дачкой дэманстравалі здольнасці да вучобы, прыносілі выдатныя адзнакі, а маці з бацькам марылі пра апошні званок, працяг адукацыі, перспектыўныя спецыяльнасці дзяцей, шчаслівыя іх сем'і, унукаў. І тут 15-гадовы нашчадак здуру спрабуе наркотыкі, хутка трапляе ў калонію, і жыццё сям'і ператвараецца ў кашмар: усё цямнее, бурыцца, патухае, нібы па дарозе ў прорву.**



## Два шляхі

...Калі сёння сустрэць на вуліцы Дзмітрыя Марціноўскага, высокага, стройнага, з адкрытай усмешкай, можна прыняць яго за маладога чыноўніка, паспяховага бізнесмена, кваліфікаванага рабочага, чалавека творчай прафесіі — ды за каго хочаш, толькі не былога наркамана з крымінальнымі радкамі ў біяграфіі.

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

# ВЕРЫЦЬ У СЯБЕ І Ў БЕЛАРУСЬ

## Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА ўручыў пашпарты юным грамадзянам Беларусі

**Напярэдадні Дня Канстытуцыі Беларусі найлепшым прадстаўнікам моладзі, якія маюць асаблівыя заслугі ў вучобе, спорце, грамадскай дзейнасці, уручаюць пашпарты ва ўрачыстай абстаноўцы.**

«Пашпарт — гэта не толькі дакумент, які пацвярджае вашу асобу. Гэта дакумент, які ўказвае на прыналежнасць краіне, на тое, што за вашымі плячыма — беларускі народ. Гэта ваш першы дакумент у дарослае жыццё. А сталенне — гэта ўсведамленне таго, што вы неабходныя сваёй сям'і, сваёй малой радзіме, сваёй краіне», — звярнуўся да юных суайчыннікаў Ігар Сергеенка.

Якую б прафесію праз некалькі гадоў ні абралі хлопцы і дзяўчаты, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта пажадаў ім быць мэтанакіраванымі, добра вучыцца, знайсці сябе ў жыцці — каб перш за ўсё заставацца чалавекам і грамадзянінам, верыць у сябе і верыць у сваю Беларусь.

«За такімі вось дзецьмі — будучыня нашай краіны, і наша краіна такімі людзьмі проста прырастае. Ім ёсць кім ганарыцца: сваёй краінай, сваімі бацькамі, тымі пакаленнямі, якія заваявалі мірнае неба і свабоду, якія адстаялі незалежнасць нашай краіны ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны», — сказаў журналістам Ігар Сергеенка.



Фота БелТА.

Ад імя равеснікаў **вучаніца Дзісненскай сярэдняй школы Міёрскага раёна Паліна ВАЛЕНЦІК і вучаніца сярэдняй школы № 15 Гродна Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА** паабяцалі справай даказаць: моладзь — годныя грамадзяне Беларусі. Дзяўчаты падарылі Ігару Сергеенку ляльку ў нацыянальным строі.

«Здорава, калі кожны разумее, што гэта надзяляе асаблівай адказнасцю ў такі ўрачысты момант, таму што ўсе дасягненні і перамогі, якія ёсць сёння ў хлопцаў і дзяўчат, — гэта сапраўды на карысць і сваёй малой радзіме, дзе яны жывуць, і ў цэлым роднай Беларусі», — адзначыў **першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Дзмітрый ВАРАНЮК.** Ён падкрэсліў: галоўнае, што ў нашай краіне створаны ўсе ўмовы, каб юнакі і дзяўчаты маглі развівацца.

Кожны ўдзельнік цырымоніі атрымаў у падарунак ад БРСМ дзяржаўны сцяг Беларусі і сувеніры. Для юных грамадзян таксама правялі экскурсію па Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Ва ўрадзе

# НАЛАДЗІЦЬ РАБОТУ КАНТРОЛЬНАГА ЗВЯНА

## «Эфектыўнасць дзяржсектара ніжэйшая, чым на прыватных прадпрыемствах»

**Па словах прэм'ер-міністра, прычын для гэтага некалькі, але адна з асноўных — нізкая якасць кіравання прадпрыемствамі. «Кажучы пра нізкую якасць кіравання, я маю на ўвазе не толькі нанятага кіраўніка прадпрыемства, але і недастаткова эфектыўную сістэму ўладальніцкага нагляду з боку дзяржаўных органаў і пакуль слабую работу прадстаўнікоў дзяржавы ў органах кіравання», — сказаў Сяргей РУМАС на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Яно было прысвечана рабоце прадстаўнікоў дзяржавы ў органах кіравання гаспадарчых таварыстваў, акцыі якіх належаць дзяржаве.**

З боку рэгулятара існуюць актуальныя заканадаўчыя акты, а ў практычным выкананні прысутнічаюць праблемныя пытанні. Асноўнае, як адзначыў прэм'ер-міністр, — не ўсе правільна разумеюць фундаментальныя прынцыпы карпаратыўнага кіравання. «Скажонае разуменне месца і ролі назіральных саветаў у кіраванні прадпрыемствам прыводзіць да сур'ёзных сістэмных памылак і наступстваў, за якія разлічваецца ў асноўным бюджэт», — удакладніў ён.

Каб змяніць сітуацыю, было прынята рашэнне аб павелічэнні прадстаўленасці ў органах кіравання таварыстваў — абапіраючыся на вопыт, прадстаўнікі дзяржавы ў найбуйнейшых арганізацыях павінны былі выбудаваць сістэму прыняцця рашэнняў і кантролю, расставіць прыярытэты і падабраць у назіральныя саветы кампетэнтных спецыялістаў.

З таго часу прайшоў амаль год. Ацэнку рабоце (перш за ўсё па групе прадпрыемстваў топ-100) у сваім дакладзе даў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй Гаеў.

Па словах Сяргея Румаса, мяркуючы па статыстыцы, сувязь тэмпаў росту вытворчасці працы і заробкаў назіраецца вельмі розная: «Палова прадпрыемстваў з топ-100 у 2019 годзе з гэтай задачай не справілася».

Па інфармацыі старшыні Саўміна, летась некаторыя арганізацыі не прадугледзелі скарачэнне страт у парадку дня назіральных саветаў.

«Было даручана аптымізаваць крэдытныя партфелі, папрацаваўшы з абслугоўваючымі банкамі. Да рашэння гэтай задачы, мяркуючы па справаздачах, некаторыя таварыствы таксама падышлі фармальна, — падкрэсліў Сяргей Румас. — Відавочна, што персанальныя задачы, вызначаныя прадстаўнікамі дзяржавы, у поўным аб'ёме не выкананы. Відавочная адсутнасць неабходнай каардынацыі з боку органаў уладальніцкага нагляду і Дзяржкаммаёмасці».

Таксама ён звярнуў увагу, што для распрацоўкі стратэгій развіцця ўрад даручаў прыцягнуць навуковы патэнцыял Мінэканомікі і Акадэміі навук.

«Што маем? У кожным чацвёртым таварыстве з топ-100 у 2019 годзе пытанне вызначэння стратэгіі развіцця па назіральным савеце не разглядалася», — канстатаваў прэм'ер.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# НЕ Ў КОЛЬКАСЦІ, А Ў СУТНАСЦІ

## Учора прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС наведаў Маскву

**Ён правёў сустрэчу са сваім расійскім калегам Міхаілам Мішусціным і намеснікам старшыні Савета бяспекі Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым.**

З прычыны зніжэння паставак нафты з Расіі тавараабарот краін з пачатку года скараціўся, дарэчы, разам з адмоўным сальда Беларусі ў гэтым гандлі. У фокусе ўвагі перагавораў былі і спрэчныя пытанні па стратэгіі інтэграцыі ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Адна з праблем датычыцца тарыфаў на пастаўку энерганосьбітаў.

Кіраўнік беларускага ўрада расказаў, не ўдаючыся ў падрабязнасці, што прадставіў калегу новыя прапановы па пастаўках нафты. «Сапраўды, сітуацыя апошнім часам змянілася, цэны на нафту ўпалі. У сувязі з гэтым беларускі бок прадставіў расійскаму новыя прапановы для нафтавых кампаній, якія расійскі бок прыняў, паабяцаўшы на працягу некалькіх дзён правесці кансультацыі з нафтавымі кампаніямі і даць адказ, — перадае словы прэм'ер-міністра БелТА. — На першы погляд, гэтыя прапановы не былі адхіленыя расійскім бокам. Я думаю, мы прасунемся па вырашэнні нафтавай спрэчкі».

Сяргей Румас адзначыў, што незалежна ад дамоўленасцяў з Расіяй па нафтавых пытаннях краіна будзе набываць па два танкеры альтэрнатыўнага «чорнага золата» штомесяц. «Пытанне толькі ў тым, ці будзем мы браць шмат гэтай альтэрнатыўнай нафты, як мы сёння бяром, ці гэта будуць мінімальныя партыі, для таго каб мы разумелі і адчувалі рынак», — сказаў старшыня Саўміна.

На перагаворах кіраўніка беларускага ўрада з Дзмітрыем Мядзведзевым абмеркавалі стан сусветнай эканомікі, сферу бяспекі.

**Адказваючы на пытанні журналістаў, Сяргей Румас звярнуўся і да ўнутранай эканамічнай палітыкі нашай краіны. Па яго словах, паказчыкі інфляцыі на працягу двух мінулых месяцаў адпавядаюць чаканням урада. «З аднаго боку, здаецца, што гэта высокі паказчык: у нас інфляцыя па 2020 годзе павінна знаходзіцца ў межах пяці працэнтаў. Але калі мы паглядзім, то ў гэты час адбывалася выраўноўванне рэгуляваных цэн», — канстатаваў прэм'ер-міністр.**

**Таксама ён пракаментаваў сітуацыю на валютным рынку, адзначыўшы адсутнасць панікі. На яго думку, людзям хвалявацца няма ніякага сэнсу, сітуацыя стабільная і прадказальная.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки»** (Организатор аукциона) **извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «Отдых-2010»** (Продавец), **расположенного по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Драчковский с/с, 23, вблизи д. Волма**

**Лот № 1,** состав: 1. Административное здание, инв. № 614/С-23465, 105,8 кв. м. 2. Гостевой домик № 1, инв. № 614/С-41796, 74,8 кв. м. 3. Гостевой домик № 2, инв. № 614/С-42046, 75,7 кв. м. 4. Гостевой домик № 3, инв. № 614/С-42050, 76,3 кв. м. 5. Гостевой домик № 4, инв. № 614/С-42051, 117,3 кв. м. 6. Здание КПП, инв. № 614/С-23933, 40,7 кв. м. 7. Физкультурно-оздоровительный комплекс, инв. № 614/С-23462, 350,8 кв. м. 8. Овощехранилище, инв. № 614/С-23936, 110,5 кв. м. 9. Столовая, инв. № 614/С-23469, 698 кв. м. 10. Радиоузел, инв. № 614/С-23932, 11,4 кв. м. 11. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46148, 1370,6 кв. м. 12. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46146, 787,5 кв. м. 13. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46147, 799,1 кв. м. 14. Здание туалета, инв. № 614/С-46183, 14,1 кв. м. 15. Электрощитовая, инв. № 614/С-46182, 8,2 кв. м. 16. Артезианская скважина, инв. № 614/С-23466, 71 кв. м. 17. Водонапорная башня, инв. № 614/С-23939, объем 25 куб. м. 18. Сеть водоснабжения, инв. № 614/С-23937, 1303,2 кв. м. 19. Сеть кананализации, инв. № 614/С-23940, 1213,9 кв. м. 20. Тепловая сеть, инв. № 614/С-23938, 375,7 м. 21. Газопроводы высокого и низкого давления, инв. № 614/С-46057, 515,6 м. 22. Телефонная канализация, инв. № 614/С-46224, 11,2 кв. м. 23. Прочее имущество (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by). Земельный участок для обслуживания объектов недвижимости №№ 1–22 площадью 6,0528 га с кадастровым номером 624800000001000405. Право постоянного пользования. Земельные участки для обслуживания части объекта недвижимости №19: 1. Площадь 0,0049 га, кадастровый номер 624800000001005031. 2. Площадью 0,1302 га, кадастровый номер 624800000001005032. 3. Площадь 0,0001 га, с кадастровй номер 624800000001005033. 4. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005034. 5. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005035. 6. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005036. 7. Площадь 0,0027 га, кадастровый номер 624800000001005037. 8. Площадь 0,1324 га, кадастровый номер 624800000001005038. Право постоянного пользования. Начальная цена – 1 497 179,79 бел. руб. с НДС. Задаток – 250 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 23.03.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 23.03.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 19.03.2020 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.2019.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. |
| **Продавец** | ОАО «ГЗИП», 246050, г. Гомель, ул. Интернациональная, д. 49. |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |
| **Предмет электронных торгов:** | |
| **Сооружение специализированное коммунального хозяйства** (очистные сооружения) общ. пл. 146,4 кв. м, инв. № 350/С-135550, по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Интернациональная, 49А. **Составные части и принадлежности:** резервуар дождевых вод, песколовка, здание очистных сооружений. **Сведения о земельных участках:** 1) предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания очистных сооружений, общ. пл. 0.0172 га; 2) предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания приемного резервуара, общ. пл. 0,0112 га | |
| ***Начальная цена (с НДС 20 %) – 63 662,40 бел. руб.*** | |
| **Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США **(USD) – BY76BLBB30120191021390001004** в евро **(EUR) – BY33BLBB30120191021390001002;** в российских рублях **(RUB) – BY22BLBB30120191021390001006** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 2 % от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 11.01.2020 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | |
| Начало торгов: **11.00 23.03.2020.** Окончание торгов: **12.00 23.03.2020.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок** | |
| Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 20.03.2020 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **+375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

На слыху

# УСЯГО — ДВАНАЦЦАЦЬ

## Тры новыя завезеныя выпадкі каранавіруса выяўлены ў Гомелі, Гродне і Мінску

**Інфекцыя ў людзей, якія вярнуліся з-за мяжы — з Партугаліі, Германіі і Італіі. Усе яны шпіталізаваныя.**

У беларуса, які вярнуўся з Партугаліі, у межах актыўнага лабараторнага кантролю, што праводзіцца ў Нацыянальным аэрапорце Мінск, быў атрыманы станоўчы тэст на РНК каранавіруса.

— У цяперашні час РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі праводзіць паглыблены паўторны лабараторны кантроль аналізаў гэтага грамадзяніна. Ён шпіталізаваны ў Гомельскую абласную інфекцыйную клінічную бальніцу. На сёння яго стан здавальняючы, — расказала **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.** — Праводзіцца актыўная шпіталізацыя пацыентаў першага ўзроўню — тых, хто прыехаў разам з ім з-за мяжы, а таксама быў побач у самалёце. З улікам таго, што тэст праведзены пры ўездзе ў краіну, пагроза далейшага распаўсюджання ацэньваецца як мінімальная.

Таксама дыягностыка праводзіцца ў аднаго з пацыентаў у Мінску, які прыбыў з Германіі і ў момант праходжання граніцы ўтаіў факт знаходжання ў Паўночнай Італіі.

Што датычыцца трэцяга выпадку, то гэта пацыентка абласной інфекцыйнай бальніцы ў Гродне.

— Пры адсутнасці клінічных даных у яе атрыманы станоўчы лабараторны вынік на COVID-19. З улікам эпіднеспрыяльнасці краіны знаходжання (яна вярнулася зІталіі) жанчына сама звярнулася па медыцынскую дапамогу. Яна здала тэст яшчэ на граніцы, так што ўсе яе кантакты першага ўзроўню выяўлены, — паведаміла прэс-сакратар.

На сёння з дыягназам COVID-19 у інфекцыйных стацыянарах знаходзіцца 12 чалавек. Трое з іх рыхтуюцца да выпіскі. Ва ўсіх пацыентаў стан здавальняючы, тэмпературы і іншых клінічных праяў хваробы няма.

Міністэрства аховы здароўя яшчэ раз звярнулася да ўсіх грамадзян, якія вяртаюцца ў краіну, з просьбай: абавязкова інфармаваць спецыялістаў у зонах пагранічнага кантролю аб тым, што вы пабывалі ў эпідэмічна неспрыяльных раёнах. Акрамя таго, міністэрства заклікае ўсіх, хто вяртаецца з-за мяжы, па магчымасці абмежаваць колькасць кантактаў на працягу першых 14 дзён. А ў выпадку з'яўлення рэспіраторнай інфекцыі выклікаць хуткую дапамогу. І абавязкова паведаміць па тэлефоне, якія краіны вы наведвалі.

**Алена КРАВЕЦ.**

Рэзанансная справа

# ШТО АДБЫЛОСЯ Ў АЗАРЫЧАХ?

**Гомельскія следчыя завяршылі расследаванне рэзананснага забойства жонкі святара ў Азарычах. Крымінальная справа перададзена пракурору для далейшага накіравання ў суд.**

Летась 2 кастрычніка ў гарадскім пасёлку Азарычы Калінкавіцкага раёна ва ўласным доме была знойдзена 42-гадовая жанчына — жонка мясцовага святара — без прыкмет жыцця. Шматлікія цялесныя пашкоджанні на целе загінулай сведчылі аб крымінальным характары смерці. Пачалася інтэнсіўная адпрацоўка ўсіх версій. У выніку ўдалося аднавіць абставіны здарэння і сабраць неабходную доказную базу. Ход расследавання крымінальнай справы знаходзіўся на асабістым кантролі кіраўніцтва УСК па Гомельскай вобласці.

Па версіі следства, летась 1 кастрычніка жыхар вёскі Вязавіца знаходзіўся ў Азарычах і праводзіў рамонтныя работы ў мясцовым праваслаўным храме. Пасля рабочага дня ён патэлефанаваў сваёй дзяўчыне, яны пасварыліся, малады чалавек выпіў спіртнога. Пасля сваркі мужчына вырашыў выкрасці аўтамабіль сям'і святара, каб з'ездзіць на чужой машыне да дзяўчыны. Па звестках следства, увечары малады чалавек прыйшоў у дом настаяцеля храма. Адчыніла яго жонка, хлопец стаў патрабаваць ключы ад машыны. Жанчына адмовіла і паспрабавала зачыніць дзверы. Абвінавачаны нанёс гаспадыні ўдар нажом і трапіў унутр: збіў пацярпелую, нанёс мноства ўдараў нажом па розных частках цела, забраў ключы ад аўтамабіля, выкраў 20 долараў, 1000 расійскіх рублёў і мабільны тэлефон коштам 400 рублёў.



На выкрадзеным аўтамабілі вясковец паехаў па Калінкавіцкім раёне: заехаў на малочнатаварную ферму ў роднай вёсцы, урэзаўся ў смеццевы кантэйнер, цюк саломы і цыстэрну для вады. Сведкамі здарэння сталі работнікі фермы, якія прыйшлі на ранішнюю дойку кароў. Яны ж і забралі ў нецвярозага ключы ад машыны. Пасля гэтага малады чалавек знік, але інфармацыя аб ДТЗ была перададзена ў праваахоўныя органы.

Следча-аператыўная група правяла агляды па месцы жыхарства загінулай і па месцы знаходжання выкрадзенага аўтамабіля: адбітак участка далоні, пакінутага на месцы забойства, супаў са слядамі далоняў жыхара вёскі Вязавіцы. Падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў малады чалавек быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі. Ён назваў месцы знаходжання яго адзення і абутку, а таксама клінка ад нажа, рукаятка якога была раней знойдзена на тэрыторыі домаўладання святара. Да матэрыялаў справы былі далучаны таксама заключэнні больш чым 15 розных экспертыз.

Вядома, што раней за ўчыненне крадзяжу і хуліганства абвінавачаны ўжо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці. На падставе сабраных доказаў маладому чалавеку прад'яўлена абвінавачванне па артыкулах: разбой, здзейснены з пранікненнем у жыллё, паўторна, з прычыненнем цяжкага цялеснага пашкоджання; забойства, здзейсненае з асаблівай жорсткасцю, спалучанае з разбоем; крадзеж, здзейснены з прымяненнем гвалту, небяспечнага для жыцця і здароўя, і з пагрозай яго прымянення.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота з матэрыялаў прэс-службы УСК па Гомельскай вобласці.**

Год малой радзімы

# Кніжная Берасцейшчына: адкрыццё з розных ракурсаў

**Учора ў кнігарні «Светач» адбылася маштабная імпрэза «Кніжны свет Беларусі: Берасцейшчына». Гэтае мерапрыемства фактычна стала адкрыццём адмысловага праекта, бо плануецца яшчэ некалькі падобных імпрэз, якія будуць прысвечаны літаратурнай спадчыне кожнага рэгіёна Беларусі. Арганізатарамі праекта выступаюць Міністэрства інфармацыі, ААТ «Белкніга», выдавецтвы «Мастацкая літаратура» і «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

**Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ уручае ўзнагароду Алесю СУШЫ.**

Гэтае мерапрыемства дазволіла ацаніць найбольш заўважныя і значныя краязнаўчыя выданні і праекты ў Брэсце і Брэсцкай вобласці, сабрала вядомых беларускіх пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў гэтым рэгіёне і прысвяцілі яму пэўную частку сваёй творчасці. У вечарыне паўдзельнічалі Алесь Бадак, Леанід Дранько-Майсюк, Раіса Баравікова.

Мінулы год — юбілейны для Брэста — прынёс у скарбонку кніжнай спадчыны рэгіёна шмат каштоўных праектаў. У першую чаргу гэта маштабная краязнаўчая энцыклапедыя «Брэст. 1000 гадоў» і факсімільнае выданне Берасцейскай Біблії, падрыхтаванае Нацыянальнай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь. Таксама зусім нядаўна з'явілася манаграфія за аўтарствам намесніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алеся Сушы, прысвечаная паўнавартаснаму даследаванню асабліваcцяў Берасцейскай Біблії і месца, якое гэта легендарнае выданне займае ў гісторыі.

Міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч выказаў падзяку ўсім пісьменнікам, якія робяць свой унёсак у літаратурную спадчыну Брэстчыны, усім, хто спрычыніўся да стварэння адмысловых краязнаўчых і гістарычных праектаў.

Аляксандр Карлюкевіч таксама адзначыў: вельмі важна, каб кніга з дзяржаўнага ці прыватнага выдавецтва атрымлівала сваё распаўсюджанне, ішла па краіне, займела вагу на ўсіх узроўнях грамадства, прысутнічала ў тым ліку ў сацыяльных сетках і сваёй прысутнасцю рухала духоўнае развіццё нашага грамадства.

Многія госці мерапрыемства, якія зрабілі каштоўны ўнёсак у брэсцкае краязнаўства і гісторыю, былі адзначаны спецыяльнымі ўзнагародамі Міністэрства інфармацыі.

**Дар'я СМІРНОВА.**

Не сезон

# ПЕРАНЕСЕНЫ ТЭРМІНЫ ВЕСНАВЫХ ЗАБАРОН НА ЛОЎЛЮ РЫБЫ

**У сувязі з анамальна цёплым надвор'ем і раннім нерастам забароны на лоўлю рыбы пачнуць дзейнічаць раней ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

У Брэсцкай і Гомельскай абласцях — з 12 сакавіка да 18 мая, у Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцях — з 22 сакавіка да 30 мая, у Віцебскай вобласці — з 31 сакавіка да 8 чэрвеня. Новыя тэрміны забарон устаноўлены пастановай Мінпрыроды № 2 ад 4 сакавіка 2020 года, у сярэднім яны перасунуты на 8—10 дзён.

На гэты час аматарскае рыбалоўства цалкам не забаронена, але істотна абмежавана: рыбачыць можна толькі адной вудай з адным кручком або адным спінінгам, аснашчаным штучнай прынадай, з адным адзінарным, або двайным, або трайным кручком у светлы час сутак з берага (без заходу ў ваду), са штучных збудаванняў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Сі Цзіньпін заявіў, што распаўсюджанне каранавіруса практычна спынена



Старшыня КНР упершыню з пачатку эпідэміі нечакана наведаў яе галоўны горад-ачаг — Ухань, адміністрацыйны цэнтр правінцыі Хубэй. Ён пабываў у інфекцыйнай бальніцы, якую ва ўмовах надзвычайнай сітуацыі пабудавалі тут усяго за дзесяць дзён, пагутарыў па відэасувязі з некаторымі пацыентамі і ўрачамі, сустрэўся з жыхарамі аднаго з раёнаў. Незадоўга да таго нацыянальнае міністэрства аховы здароўя падзялілася з грамадзянамі абнадзейлівымі навінамі: за мінулыя суткі ў краіне зафіксавана ўсяго каля 20 новых выпадкаў заражэння. Для параўнання: у Італіі іх звыш тысячы. У канцы студзеня Хубэй амаль цалкам апынуўся ў ізаляцыі. Днямі тым, хто не заразіўся і не быў у цесным кантакце з інфіцыраванымі, было дазволена свабодна перамяшчацца, праўда, толькі ў межах правінцыі. Паведамляецца, што паслабленні не закрануць Ухань. У рамках падтрымкі і ў якасці жэсту салідарнасці Пекін адпраўляе ў Італію вызваленых урачоў, два мільёны масак, а таксама тысячы апаратаў вентыляцыі лёгкіх, якіх на Апенінах, сведчаць медыкі, вельмі не хапае.

## Эстонія абвясціла аб пачатку крызісу ў краіне

Паводле заявы міністра фінансаў Эстоніі Марціна Хельме, у краіне пачаўся эканамічны крызіс, перадае «Інтэрфакс». Чыноўнік удакладніў, што такога рэзкага падзення ў эканоміцы не назіралася з 2008 года. Крызіс, безумоўна, будзе мець свае «наступствы ў рэальным жыцці». «Балансы прадпрыемстваў рэзка скароцяцца, а банкі пачнуць адкліканне крэдыты або патрабаваць дадатковае забеспячэнне», — падзяліўся Марцін Хельме сваім бачаннем сітуацыі. Ён таксама асцерагаецца, што прадпрыемствы, якія «фінансуюць сябе выпускам аблігацый, больш не змогуць гэта рабіць». Зараз галоўная задача ўрада — звесці наступствы эканамічнага крызісу да мінімуму, каб сітуацыя як мага менш закранула простых людзей, расказаў кіраўнік Мінфіна Эстоніі.

## Топ-10 мільярдэраў за дзень страцілі $37,7 млрд

Гэта адбылося пасля абвалу фондавых рынкаў. Топ-10 галоўных няўдачнікаў «чорнага панядзелка» ўзначаліў уладальнік Dior і Louis Vuitton Бернар Арно — яго капітал паменшыўся на $6 млрд. Найбагацейшы мільярдэр свету, заснавальнік і кіраўнік Amazon Джэф Безас збяднеў за дзень на $5,6 млрд. Акцыі Amazon патаннелі больш чым на 5 працэнтаў, абнавіўшы двухмесячны мінімум. На працягу мінулага тыдня Безас страціў яшчэ $14,1 млрд. Капітал Уорэна Бафета за дзень скараціўся на $5,4 млрд на фоне падзення акцый Berkshire Hathaway да самага нізкага ўзроўню з пачатку года. Мексіканскі тэлемагнат Карлас Слім згубіў за дзень $5 млрд (8 працэнтаў капіталу). Заснавальнік і кіраўнік Facebook Марк Цукерберг замкнуў першую пяцёрку галоўных няўдачнікаў з «мінусам» у $4,2 млрд.

# ЦІ ТРЭБА «СКАКАЦЬ» ВАКОЛ ТУРЫСТАЎ?

## Пра колькасць і якасць

**Гаспадар аграэкасядзібы «Ёдзішкі» Андрэй АБРАМАЎ** заўважае, што калі ў 2014—2015 гадах назіраўся ўсплёск цікавасці да адпачынку ў беларускай вёсцы, то цяпер актыўнасць, напрыклад, у тых жа расійскіх турыстаў пачала падаць. Ён лічыць, што адна з прычын у тым, што ў некаторых месцах надта ўжо хочуць дагадзіць гасцям, а фальш і бутафорыя адпужваюць турыстаў. Да таго ж асобныя гаспадары падманваюць сваіх гасцей, выдаючы прадукты з сеткавага гандлю за хатнія. Андрэй Міхайлавіч прыводзіць лічбы: з 200 сядзіб, зарэгістраваных на Браслаўшчыне, актыўна працуе ўсяго каля двух дзесяткаў. «Ва ўсіх чамусьці стэрэатып, што грошы можна зарабіць на агратурызме, толькі калі сустракаць вялікую колькасць людзей. Я больш за дзве сям'і не прымаю, а маю выручку ў разы большую, чым у сядзібе, якая проста здае ложкі ў арэнду ці прымае вялікія групы, якія яшчэ могуць нешта і зламаць», — кажа ён.

Вялікага сакрэту поспеху сядзібы Абрамава няма — большасць прыбытку прыносіць ферма, 70 працэнтаў выдаткаў турыста тут прыпадае на ежу. Часта сюды прыязджаюць гараджане на кулінарныя майстар-класы — напрыклад, па прыгатаванні стэйка. Тут можна цалкам паглыбіцца ў побыт, пазнаёміцца з тэхналогіяй вытворчасці сапраўдных вясковых прадуктаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ёсць і іншыя аграсядзібы, якія гатовы забяспечыць сваіх пастаяльцаў уласнымі, так сёння запатрабаванымі экапрадуктамі. Асобныя гаспадары спрабуюць прывабіць турыстаў крэатыўнасцю, рыхтуюць цікавыя праграмы, бяруцца за арганізацыю свят, адраджаюць традыцыі, збіраюць экспанаты для ўласных міні-музеяў. Але калі ў нас так хутка і моцна вырасла колькасць сядзіб, дзе гарантыя, што турыст даедзе менавіта да крэатыўных і ўважлівых гаспадароў, а не натрапіць на ўладальніка, які папросту здае жыллё на вёсцы? А льготы ўсе атрымліваюць аднолькавыя.

Між іншым, некаторыя «плюшкі» ў будучым могуць адмяніць. У прыватнасці, крэдытная падтрымка сёння не такая ўжо і патрэбная. Усё менш гаспадароў звяртаюцца па яе ў банк. Галіна дастаткова развілася, людзі ўжо ўкладаюць уласна зробленыя грошы, знаходзяць донараў, якія гатовы фінансаваць пэўныя праекты, звязаныя з развіццём вясковых тэрыторый. «Калі ў 2014 годзе мы заключылі 49 крэдытных дагавораў, у 2015 — 42, то апошнія два гады па 16. Гэта сведчыць, хутчэй за ўсё, пра тое, што бізнес сфарміраваўся, і засталіся тыя, хто можа на гэтым рынку працаваць», — заўважае **дырэктар дэпартамента карпаратыўнага бізнесу ААТ «Белаграпрамбанк» Андрэй ДЖУНКОЎ.**

Наогул з усіх на дадзены момант зарэгістраваных сядзіб толькі 500 актыўна займаюцца агратурызмам. Для некаторых гаспадароў дамок на вёсцы — гэта ўсяго толькі магчымасць дадаткова падзарабіць, і здаецца ён толькі ў цёплы сезон года.

## Шумны бізнес?

Як паведаміў **намеснік дырэктара дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Віталь ГРЫЦЭВІЧ,** у найбліжэйшы час будуць збірацца і абмяркоўвацца прапановы, якія датычацца агратурыстычнага заканадаўства. Бясспрэчна, закон, які дзейнічае цяпер, паспрыяў развіццю вясковага турызму, але і дадаў пэўныя праблемы. «Калі ў тэксце ўказа прапісалі магчымасць правядзення карпаратываў, банкетаў і другіх урачыстых мерапрыемстваў, мы адкрылі маленькую скрыню Пандоры. Нават у дэпартаменце колькасць скаргаў на шум ад людзей, што жывуць побач з сядзібамі, значна вырасла. Я баюся падумаць, што робіцца на месцах. Таму мы і хочам параіцца з гаспадарамі сядзіб, мясцовымі ўладамі, не зможам абысціся без меркавання органаў унутраных спраў, якія атрымліваюць падобныя скаргі, каб ведаць, што рабіць далей», — заўважыў Віталь Валер'евіч.

Бясспрэчна, яшчэ давядзецца паламаць галаву над тым, як, змагаючыся з «шумным бізнесам», а хутчэй з уладальнікамі, якія проста ўручаюць ключы ад сядзіб кліентам, не нашкодзіць тым аграсядзібам, якія сапраўды працуюць на імідж краіны. Тое ж вяселле ці карпаратыў — гэта не ўсюды стыхійная шумная п'янка, гэта можа быць і сапраўднае свята для вёскі, калі гаспадары сядзіб вывучаюць і стараюцца адрадзіць старыя традыцыі, спевы, кухню, запрашаюць мясцовыя фальклорныя калектывы.

## Разам — прасцей?

Сёння тыя, хто хоча прасоўваць свае тэрыторыі, вучацца ўзаемадзейнічаць. Аграсядзібы, рамеснікі, работнікі культуры, школы, музеі аб'ядноўваюцца ў кластары і ствараюць адзіныя насычаныя рознымі забавамі турпрадукты. Так, кааперацыя «Валожынскія гасцінцы» ўжо прапаноўвае каля дзясятка разнастайных маршрутаў. Паступова развіваюцца такія зялёныя маршруты, як «Муховэцька кумора», «Велесаў шлях», «Заходняя скарбонка». Ужо заявіў пра сябе кластар «Церам забаў» у Шчучынскім раёне.

Як паведаміў гаспадар сядзіб «У Барысавіча» і «Вусцье LIFE» Юрый Жарко, энтузіясты працуюць над стварэннем новага турпрадукту «Браслаўская кругасветка». Да праекта ўжо далучыліся крама сувеніраў ручной работы, музей катоў, кавярня з беларускай кухняй, аграсядзібы, якія прапануюць экаежу, экскурсію па цяпліцах, кантактныя заапаркі, квэсты, водныя і конныя маршруты.

Іншае стала стаўленне да зялёных маршрутаў: сёння яны павінны быць інтэрактыўнымі. Адзін з такіх пілотных праектаў — «Славянская гісторыя Мсціслава». Маршрут разлічаны амаль на пяць гадзін, падчас яго турысты даведваюцца пра культуру, гісторыю раёна, традыцыйныя рамёствы, кухню і сучаснае жыццё раёна. Новы маршрут ужо зацікавіў суседзяў — падпісана пяць пагадненняў з расійскімі тураператарамі. З наступнага года плануецца актыўна развіваць турызм у раёнах, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. Сёння ўжо адкрыты доступ для арганізаваных груп у Палескі радыяцыйны запаведнік, але турыстам патрэбна інфраструктура — і асобы, якія пажадаюць адкрываць аграсядзібы вакол запаведніка, змогуць разлічваць на фінансавую падтрымку.

Менавіта дзякуючы намаганням гаспадароў такіх аграсядзіб расце цікавасць да Беларусі ў замежных турыстаў. Летась у нашых вёсках адпачывала амаль 60 тысяч замежнікаў з 78 дзяржаў, да нас даехалі госці нават з Бахрэйна, Філіпін, Мазамбіка, Сенегала. Натуральна, пакуль самім гаспадарам сядзіб складана самастойна выходзіць на такія далёкія рынкі, і ім на дапамогу прыйшлі тураператары. Напрыклад, дзве траціны канадцаў трапіла ў беларускія аграсядзібы дзякуючы апаратарам, а з Фінляндыі — ажно 80 працэнтаў. Прычым такое супрацоўніцтва становіцца больш зладжанае. Усё менш робіцца адмоў ад прыёму арганізаваных груп турыстаў толькі таму, што сядзіба забраніравана на карпаратыў. І наогул большае ўласнікаў, якія нацэлены хутчэй на прыём гасцей, чым на правядзенне ўрачыстасцяў.

**Старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА** ўпэўнена, што ў законе па агратурызме нічога мяняць не варта, бо лепшага дакумента, які спрыяў бы развіццю вясковых тэрыторый, не прыдумаеш. І сёння мы бачым цудоўныя вынікі. На вёсках ствараюцца новыя рабочыя месцы, у некаторых сядзібах працуюць па тры сям'і, да справы бацькоў далучаюцца іх дзеці і нават унукі. Да таго ж многія гаспадары разумеюць, што гасцей трэба нечым карміць, і спрабуюць сябе ў фермерскай справе. Не трэба забывацца, што калі гаспадаркі пашыраюцца, яны ствараюць пэўную інфраструктуру, аздабляюць тэрыторыю, а значыць, набываюць для гэтага матэрыялы ў Беларусі і даюць магчымасць зарабіць іншым.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## Правілы правядзення рэкламнай гульні
# «СМАЧНЫ НАДВЯЧОРАК СА «ЗВЯЗДОЙ»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Смачны надвячорак са «Звяздой» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 14 сакавіка 2020 года да 30 чэрвеня 2020 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2020 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Смачны надвячорак са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці Установы і складаецца з наступных рэчаў.

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Грыль-барбекю Sundays Allan KY-22018G-16W (далей — суперпрыз) | 1 | 129,00 | 129,00 |
| 2 | Тэрмас з лагатыпам «Звязда» (далей — прыз) | 7 | 52,8 | 369,6 |

Усяго прызавы фонд рэкламнай гульні «Смачны надвячорак са «Звяздой» складае 498,6 руб. (чатырыста дзевяноста восем рублёў шэсцьдзясят капеек).

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Смачны надвячорак са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «»Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2020 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2020 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 14 сакавіка 2020 года да 13 красавіка 2020 года выразаная з газеты або з дададковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 14 сакавіка да 13 красавіка 2020 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або дасланыя Установе пасля 13 красавіка 2020 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Дашкевіч Юлія Андрэеўна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Корбут Віктар Эдуардавіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 17 красавіка 2020 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сарціруюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага рэгіёна).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або членаў Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца назва выйгранага прыза і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да

27 красавіка 2020 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 27 красавіка 2020 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2020 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2020 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе

2020 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правіл.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 чэрвеня 2020 года ў памяшканні Установы па адрасе: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам Гульні па тэлефоне (017) 263 66 73, 287 17 40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, Установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 чэрвеня 2020 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Смачны надвячорак са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне

(017) 263 66 73, 287 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3758 ад 06.03.2020 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
12 САКАВІКА 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 5 (15882)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Ліга смеху

«ДЗЕЦІ ЦЬЮРЫНГА»:

# «Нашы апетыты растуць»

**«Беларусы — самыя ўплывовыя людзі XXI стагоддзя». «На сёння ў нас ёсць дзве задачы. Па-першае, мы павінны прайсці ў адну чацвёртую. А па-другое, нам як беларусам важней выйсці да мора, таму першачарговая задача на сённяшні дзень — затапіць Прыбалтыку, а больш канкрэтна — Літву». «Заўтра мы з вамі прачнёмся ў адной вялікай краіне — у адной Беларусі». «Прызнайцеся, што вы нават і падумаць не маглі, што ваша новая канстытуцыя — беларуская». Гэтыя жарты ўжо папоўнілі залатую калекцыю класікі КВЗ. Каманда факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ «Дзеці Цьюрынга» не толькі здолела прабіцца ў Вышэйшую лігу Клуба вясёлых і знаходлівых, але і літаральна «парвала залу» ў сваёй першай гульні, здзейсніўшы мару многіх КВЗэшнікаў, — «злавіла паравоз» — доўгія авацыі, якія не спыняюцца, а толькі нарошчваюць тэмп. Прычым не аднойчы. А гэта дарагога варта. Мы сустрэліся з двума прадстаўнікамі каманды (сабраць разам усіх праблематычна), каб пагутарыць пра тое, што не відаць звычайнаму гледачу тэлеэфіру гульні. Нашымі суразмоўцамі сталі Марк ВЯЛІЧКА (капітан) і Аліна КАРПОВІЧ.**

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



Фота са старонкі каманды «УКантакце».

Карысны досвед

## «ДОЙЛІДЫ» СВАІХ ДОБРЫХ ЭМОЦЫЙ

**У студатрадаўскім руху адным з самых папулярных кірункаў лічыцца будаўнічы. Найлепшым у гэтай намінацыі па выніках леташняга Усебеларускага з'езда студэнцкіх атрадаў «Час руху!» сталі «Дойліды» з Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Таксама найлепшымі былі прызнаныя камандзір і камісар гэтага атрада — Уладзіслаў Шынкевіч і Валянцін Бараноўскі. Мы пагаварылі з імі і іншымі байцамі пра атрыманы вопыт работы. Што галоўнае яны набылі падчас трэцяга працоўнага семестра?**

— У студэнцкім активе я з першых курсаў вучобы. Тады ж дазнаўся пра будаўнічыя атрады і вырашыў паспрабаваць, — апавядае студэнт-чацвёртакурснік інжынерна-будаўнічага факультэта Уладіслаў ШЫНКЕВІЧ. — Упершыню паехаў у Астравец у 2018 годзе байцом. Наша каманда з 18 чалавек працавала ў горадзе падсобнымі рабочымі ў брыгадзе вопытных майстроў. На другі год я ўжо меў пасаду камандзіра, разам з іншымі хлопцамі мы шчыравалі дарожнымі рабочымі на аб'екце атамнай электрастанцыі.

Трэці працоўны семестр у «Дойлідаў» звычайна доўжыцца з пачатку ліпеня да канца жніўня. Хлопец кажа, што падчас яго дні праходзяць насычана і разам з тым напружана. На сон застаецца не больш за чатыры—пяць гадзін.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*



Байцы з атрада «Дойліды».

Ініцыятыўныя і крэатыўныя

## ВАШЫ ІДЭІ, ДЗЯРЖАВЫ – ПАДТРЫМКА

**— Дзявяты сезон праекта чарговы раз пацвердзіў высокі навукова-даследчыцкі патэнцыял беларускай моладзі, яе ўменне генерыраваць прагрэсіўныя і запатрабаваныя жыццём ідэі. Высокі інтэлект юнакоў і дзяўчат сёння робіцца асновай для далейшага росту ў самых розных сферах: ад біятэхналогій да робататэхнікі. «100 ідэй для Беларусі» — пацвярджэнне таго, што ў нашай краіне таленавітая і думаючая моладзь, — адзначыў падчас фіналу гэтага рэспубліканскага конкурсу намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.**

А паглядзець сапраўды было на што...

Вялікую ўвагу да сябе прыцягнуў адзін з праектаў-пераможцаў, які прадставіў студэнт другога курса Бабруйскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа Павел ШАЎЦОЎ. Ён прэзентаваў трэнажор для дзяцей «Юны ратавальнік». Галоўная яго мэта — у больш даступнай форме навучыць малечу правілам пажарнай бяспекі.

— Ад ідэі да стварэння — год, адзін экзэмпляр вырабляем за два-тры месяцы. Нам хацелася зрабіць менавіта фізічную рэч, бо так дзеці лягчэй засвойваюць карысны матэрыял. Тут ёсць круг, падзелены на шэсць лакацый, што перыядычна загараюцца. Ёсць і рычаг, пры дапамозе якога можна «патушыць» пажар. Прынцып такі: спачатку гучыць сігнал, які канстатуе: у доме агонь. Пасля трэнажор апавяшчае, што рабіць у такой сітуацыі. А далей для дзяцей пачынаецца гульня: яны разважаюць, як найлепш паступіць, а інструктар, што прысутнічае побач, дапамагае ім і падсумоўвае атрыманую інфармацыю. Такім чынам юныя ўдзельнікі добра запамінаюць правілы пажарнай бяспекі.



Удзельніцы творчай групы «Лялька. Бай».

Адукацыйная гульня арыентавана на вучняў малодшых і сярэдніх класаў, а таксама на выхаванцаў дзіцячых садкоў. Павел расказаў, што праект ужо быў пратэсціраваны ў Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Бабруйска, таксама на працягу года каманда распрацоўшчыкаў супрацоўнічала з інспектарамі сектара прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. «Мы ўжо заключылі дагавор з некаторымі ўстановамі адукацыі. Калі будзе попыт, гатовы задаволіць усе запыты заказчыкаў», — запэўнівае хлопец.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
12 03 2020 г.

*Знайсці сябе*

# ЖЫВЫ ПРЫКЛАД — КАЛЯ ДОШКІ

## Чаму педагогаў-мужчын становіцца ўсё менш?

**Арыстоцель, Платон, Жан-Жак Русо, Канфуцый, Песталоцы, Канстанцін Ушынскі, Леў Выгоцкі, Януш Корчак, Джон Дз'юі, Шалва Аманашвілі... Няхай жанчыны не крыўдуюць, але, гаворачы пра вялікіх настаўнікаў, прыгадваюць пераважна педагогаў-мужчын. Для Яна Амоса Каменскага прафесія настаўніка была «найлепшая, як ніякая іншая пад сонцам». Ён параўноўваў настаўніка з садоўнікам, які любоўна вырошчвае расліны ў садзе, з архітэктарам, які клапатліва запаўняе ведамі ўсе куточкі чалавечай істоты, са скульптарам, што старанна абчэсвае і шліфуе розумы і душы людзей, з палкаводцам, які энергічна вядзе наступленне супраць варварства і невуцтва. Ян Амос Каменскі напісаў дзясяткі падручнікаў для школы і больш за 260 педагагічных твораў. Словы «ўрок», «клас», «канікулы», «навучанне» ўвайшлі ў школу разам з імем вялікага чэшскага педагога. Між іншым, «педагог» і «настаўнік» — таксама словы мужчынскага роду.**

**Але як так здарылася, што нашы школы паступова пераўтварыліся ў суцэльнае жаночае царства і трапіць да педагога-мужчыны лічыцца цяпер вялікай удачай? Ці адбіваецца на вучнях недахоп мужчынскага выхавання і як вярнуць у педагагічны працэс прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва? Гэтыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў навукова-практычнай канферэнцыі «Мужчыны ў сістэме адукацыі», якая прайшла на базе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта.**

### НЕПРЭСТЫЖНАЯ ПРАФЕСІЯ?

Як вынікае са статыстычнага агляду, падрыхтаванага да Дня настаўніка, у агульнай колькасці педагогаў, якія выкладаюць у школе асобныя прадметы, прадстаўнікі моцнага полу на пачатак 2018/2019 навучальнага года складалі 18,2 працэнта.

У топ-5 прадметаў, дзе колькасць настаўнікаў-мужчын была самая высокая, увайшлі «фізічная культура» (63,7 працэнта ад агульнай колькасці), «дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» (60,7 працэнта), «працоўнае навучанне» (43 працэнты), «фізіка» (35,5 працэнта), «гісторыя і грамадазнаўства» (28,9 працэнта).

А вось сярод настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры мужчын-педагогаў амаль няма (усяго 2,5 і 2 працэнты адпаведна). Сярод настаўнікаў замежнай мовы іх толькі 5 працэнтаў, біялогіі — 8 працэнтаў, хіміі — 9 працэнтаў. Сярод дырэктараў устаноў адукацыі і іх намеснікаў — таксама толькі 14 працэнтаў мужчын.

— Гістарычна выхаванне і навучанне было мужчынскай тэрыторыяй, але сёння мы ўсе назіраем адток з адукацыі мужчын. Ці можна яго спыніць? Мяркую, што ключавым пытаннем з'яўляецца прэстыж настаўніцкай прафесіі ў грамадстве і ўзровень аплаты працы ў гэтай сферы, — падзяліўся сваімі разважаннямі **дырэктар студыі польскай мовы Pan Profesor, магістр гістарычных навук Аляксандр ПРУДНІКАЎ.** — Калі настаўнік-пачатковец зарабляе прыблізна 200 долараў, то ці можа ён дазволіць сабе здымаць жыллё, утрымліваць сям'ю, вандраваць і гэтак далей? Пытанне рытарычнае. Таму нават пры ўсёй любові да абранай прафесіі мужчына будзе шукаць спосабы, як і дзе яму зарабіць. Прычым не толькі школа, але і сфера адукацыі могуць ім увогуле не разглядацца ў якасці варыянту. Мужчына павінен быць паспяховы, а паспяховасць у грамадстве, асабліва апошнім часам, вызначаецца колькасцю грошай, якія ты зарабляеш.

Ёсць яшчэ адна сур'ёзная праблема, уласцівая нашай рэчаіснасці, — вялікі аб'ём у школе папяровай работы, якую даводзіцца выконваць настаўнікам. Яна мужчынам увогуле незразумелая. Пра якую элітарнасць прафесіі можа ісці размова?



### РОЗНАЯ ФІЛАСОФІЯ

Між іншым, праблема фемінізацыі школьнай педагогікі актуальная абсалютна для ўсіх еўрапейскіх краін. Даследчыкі заўважаюць, што грамадскі прэстыж прафесіі нярэдка зніжаецца, калі ў ёй павялічваецца колькасць жанчын. Чым больш жанчын у індустрыі, тым вышэйшая імавернасць таго, што гэтая сфера будзе дрэнна аплачвацца.

**Мужчынскае выхаванне падштурхоўвае дзіця да спазнання межаў сваіх магчымасцяў.**

Пры гэтым у прыватных школах Вялікабрытаніі сітуацыя радыкальна адрозніваецца ад дзяржаўных, і нярэдка працэнт мужчын-педагогаў там утрая вышэйшы. Акрамя прэстыжу і памеру заробку, гэта тлумачыцца таксама гістарычнымі прычынамі і вялікім значэннем у прыватных школах пазакласных заняткаў. Чым больш прэстыжная ўстанова, тым больш будзе там спорту: крыкету, рэгбі, веславання і гэтак далей, што таксама прыцягвае мужчын. Пакуль ніхто не даказаў, што паспяховасць дзіцяці звязана з тым, місіс ці містар стаіць каля дошкі, але калі вы выбіраеце школу ў Вялікабрытаніі, то колькасць мужчын-настаўнікаў можа быць нефармальным індыкатарам яе высокага рэйтынгу.

У фемінізацыі адукацыі хапае адмоўных бакоў. Для выхавання паўнавартаснай асобы патрабуецца як жаночая, так і мужчынская філасофія жыцця. У педагогаў-мужчын і педагогаў-жанчын ролевыя паводзіны істотна адрозніваюцца. Мужчынскае выхаванне арыентаванае на дасягненне выніку, яно падштурхоўвае дзіця да спазнання межаў сваіх магчымасцяў, адкрыцця новых сфер жыцця, эксперыментаў, арыентацыі на ўласную будучыню.

Фемінізацыя школы непазбежна вядзе да так званай гуманізацыі адукацыі: жанчыны, якія сталі вядучай педагагічнай сілай, прыўносяць у сістэму адукацыі сваё разуменне свету, свае методыкі і падыходы. Усе натуральныя праяўленні спасціжэння межаў (шумныя гульні, бег, фізічнае проціборства на выяўленне самага моцнага), успрымаюцца імі як разбуральныя фактары.

Пры адсутнасці «жывога прыкладу» ў асобе настаўніка ў большасці сучасных школьнікаў фарміруецца вельмі абстрактнае разуменне так званых маскулінных (мужчынскіх) якасцяў і іх значэння ў сучасным грамадстве. А калі ўзяць пад увагу вялікую колькасць дзяцей, якія растуць у няпоўных сем'ях з адной маці, маштаб праблемы набывае памеры катастрофы.

### У «ЖАНОЧЫМ ЦАРСТВЕ»

**Кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт кафедры псіхалогіі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Валерый ПАРХАМОВІЧ** лічыць, што ў навучальным працэсе і пры стварэнні падручнікаў прыродныя патрэбы і інтарэсы хлопчыкаў не ўлічваюцца.

— Навучальныя дапаможнікі па рускай мове для пятага класа арыентаваныя на дзяўчат, — прыводзіць ён канкрэтны прыклад. — З першай да дваццаць сёмай старонкі школьнікам прапануюцца практыкаванні пераважна апісальнага характару. А давайце прыгадаем, што нас цікавіла ў гэтым узросце. Няўжо апісанне прыроды? А ці могуць такія заданні зацікавіць дзяцей з кліпавай свядомасцю?

Так ужо склалася, што мужчыны рэдка гавораць пра свае праблемы ўслых, у тым ліку і пра праблемы ў прафесійнай сферы. Мужчына павінен быць моцны, цярплівы, стойкі, не павінен скардзіцца... Але псіхалагічнае выгаранне актуальнае не толькі для педагогаў-жанчын. Настаўнікі-мужчыны могуць ад яго пакутаваць нават у большай ступені.

— Псіхалагічнае выгаранне — гэта страта інтарэсу чалавека да прафесійнай дзейнасці з прычыны нейкіх дэструктыўных абставін, немагчымасці адрэагаваць ці пераадолець пэўныя псіхалагічныя бар'еры, — тлумачыць Валерый Пархамовіч. — На што скардзяцца мужчыны, якія працуюць у школе? На адсутнасць канцэпцыі развіцця сістэмы адукацыі, прасцей кажучы, яны не ведаюць, куды трэба рухацца і які павінен быць вынік на выхадзе. З аднаго боку, задача педагога — забяспечыць індывідуальны падыход да вучня, а з другога, наша сістэма адукацыі арыентаваная пераважна на колькасныя паказчыкі. Прыблізна 80 працэнтаў мужчын не ведаюць, як вырашыць гэты канфлікт, таму ахвяруюць сваім прафесійным сумленнем, аддаючы перавагу колькасным паказчыкам. «Замест узаемадзеяння з дзіцем і яго бацькамі я запаўняю тысячы паперак», — абураюцца яны. Праблемай для педагогаў-мужчын з'яўляецца мноства супярэчлівых патрабаванняў з боку кіраўніцтва школы і кантралюючых органаў. «Мы жывём у стане пастаяннай нявызначанасці. Я кладуся спаць і не ведаю, што мяне чакае заўтра. Якую задачу перада мной паставяць?» — скардзяцца яны.

Асобная тэма — гэта работа ў атачэнні жанчын. Калі арыентавацца на сацыяльна-псіхалагічныя даследаванні, то жаночыя калектывы ў большай ступені схільныя да схаваных маніпулятыўных тыпаў узаемадзеяння. Там няма фізічнай агрэсіі, затое ёсць інтрыгі, вялікая колькасць страхаў, падазронасць, недавер, інтэрпрэтацыя нейкіх фактаў. Мужчынская псіхалогія ўспрымання свету можа ўступаць у канфлікт з жаночай, і хоць ёсць меркаванне, што прадстаўнікі моцнага полу купаюцца ва ўвазе жанчын, насамрэч у школьным калектыве ім даводзіцца падладжвацца пад сваіх каляжанак, лавіраваць паміж чужымі канфліктамі, што толькі дабаўляе напружання.

### КАР'ЕРА? ПА ДЗЕЛАВЫХ ЯКАСЦЯХ!

Адна з секцый на канферэнцыі была прысвечана пагляду студэнтаў на прафесію педагога. Сумны факт, але ў сучасным грамадстве да хлопца, які пасля школы вырашыў паступіць на педагагічную спецыяльнасць, ставяцца як да няўдачніка і адгаворваюць яго гэта рабіць. Пакрысе сітуацыя пачала змяняцца. У БДПУ канстатуюць, што ў апошнія гады сюды стала прыходзіць больш юнакоў. У гэтым навучальным годзе іх сярод першакурснікаў амаль 60 працэнтаў на факультэце фізічнага выхавання, 40 працэнтаў — на фізіка-матэматычным. Рэкардсменам стаў гістарычны факультэт — на першы курс сюды паступіла больш за 60 працэнтаў юнакоў.

**Да хлопца, які пасля школы вырашыў паступіць на педагагічную спецыяльнасць, ставяцца як да няўдачніка.**

Даволі рэдка хлопцы выбіраюць факультэты пачатковай, дашкольнай адукацыі, сацыяльна-педагагічных тэхналогій. Тым не менш і там яны ёсць. **Студэнт другога курса Данііл ЖУРАЎЛЁЎ** — будучы сацыяльны педагог. Ён сцвярджае, што да выбару прафесіі падыходзіў свядома. Яшчэ ў 13 гадоў ён разам з прадстаўнікамі Беларускай праваслаўнай царквы наведваў сацыяльна-педагагічны цэнтр, дзе знаходзіліся дзеці з праблемных сем'яў. Потым арганізоўваў лялечны тэатр «Батлейка», куды прыцягваліся цяжкія падлеткі з прытулку. А ў 10-м класе вырашыў бліжэй пазнаёміцца з работай сацыяльнага педагога ў сваёй школе: быў разам з ім у рэйдах, дапамагаў у арганізацыі школьных мерапрыемстваў. Вось такая аказалася ў яго ранняя прафарыентацыя. «Канешне, было б выдатна, калі б усе будучыя педагогі мелі магчымасць прыглядзецца да абранай прафесіі бліжэй яшчэ да моманту паступлення, каб потым не было расчаравання», — пагаджаецца ён. Хлопец упэўнены, што мужчыне прасцей знайсці падыход да цяжкіх падлеткаў. І ў гэтым яго перавага. Магчымасцяў для прасоўвання па кар'ернай лесвіцы ў мужчын-педагогаў таксама больш з прычыны іх «эксклюзіўнасці» ў школе.

**Таццяна ШЫНКЕВІЧ, студэнтка трэцяга курса факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій** (таксама будучы сацыяльны педагог) радуецца, што мужчыны знайшлі ў сацыяльнай педагогіцы штосьці цікавае для сябе, што ўсё больш хлопцаў вучацца на настаўнікаў фізікі і матэматыкі.

— Яны па прыродзе сваёй імкнуцца лідзіраваць. А ў адукацыі ў іх ёсць добрыя шанцы выбудаваць педагагічную кар'еру, — разважае Таццяна.

На пытанне, а як яна адрэагуе, калі, выбіраючы паміж ёй і педагогам-мужчынам, перавагу аддадуць яму і абапірацца будуць не на дзелавыя і прафесійныя якасці, а зыходзячы з таго, што прадстаўнікі моцнага полу ў адукацыі на вагу золата, дзяўчына задумалася і адказала: «Спадзяюся, што кіравацца будуць не гендарныя стэрэатыпамі, а ацэньваць мае здольнасці...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «ДОЙЛІДЫ» СВАІХ ДОБРЫХ ЭМОЦЫЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Бывала, што некаторыя тэлефанавалі бацькам і скардзіліся, наколькі ім цяжка на будоўлі. Іх зразумець можна, бо такая праца не для ўсіх: у каго няма стрэсаўстойлівасці, таму складаней. Дапамагала «разрадка» ў выглядзе розных актыўнасцяў: спартыўных гульняў, канцэртаў, конкурсаў і спаборніцтваў. Творчы складнік нашай дзейнасці вельмі важны, мне гэта блізка. Калі трэба, магу праспяваць, станцаваць, падтры-


Уладзіслаў Шынкевіч.

маць у любым відзе спорту. Таму летась і каманду збіраў адпаведную: энергічных і ініцыятыўных.

Уладзіслаў прызнаецца, што дзякуючы рабоце ў «Дойлідах» ён навучыўся ўзаемадзейнічаць у дарослым калектыве, а таксама прымаць крытыку. «Шчыра кажучы, быць камандзірам падабаецца мне нашмат больш, чым байцом. Хоць і лічу, што вылучацца на пасаду трэба праз некалькі гадоў пасля таго, як атрымаеш першы вопыт работы, бо толькі так будзе зразумела, на што ты здатны і якія маеш перспектывы. Сёлета хачу паспрабаваць сябе ў больш адказнай і высокай ролі — камандзіра будоўлі, калі каман-

**«Аналізуючы, што мне дае такая дзейнасць, разумею: тут з'яўляецца адказнасць перад сабою і іншымі».**

да падтрымае».

Леташні камісар «Дойлідаў» Валянцін БАРАНОЎСКІ, які цяпер вучыцца на пятым курсе інжынерна-будаўнічага факультэта, канстатуе, што ва ўніверсітэце рух студэнцкіх атрадаў у кожнага на слыху. Таму нядзіўна, што ўжо два гады хлопец выбірае замест летняга адпачынку працу.

— Такі вопыт — гэта выдатны спосаб праверыць сябе на трываласць. Акрамя таго, неблагая магчымасць зарабіць і зарадзіцца добрымі эмоцыямі. Як камісар я адказваў за культурныя мерапрыемствы, але асноўным штодзённым абавязкам былі дарожныя рамонтныя работы. Каб можна было паспрабаваць свае сілы ў розных справах, дазвалялася мяняцца зонай адказнасці са сваімі калегамі. Дзякуючы нашым атрадзе пакуль што няма, але мы працуем над тым, каб гэта змяніць, — дзеліцца Валянцін.

Суразмоўнік расказаў, што падчас трэцяга семестра ў Астраўцы ён набыў новыя навыкі, якія вельмі дапамагаюць яму цяпер у паўсядзённым жыцці.

— Раней не ўмеў нічога рабіць у графічных рэдактарах кшталту фоташопа, але так выйшла, што для падрыхтоўкі да аднаго конкурсу гэтыя веды спатрэбіліся. Хутка навучыўся, і мне спадабалася. Таксама зразумеў, што ніхто, акрамя мяне, не вырашыць мае праблемы: з'явіліся — вырашай.

**«Увогуле ўдзел у студатрадах можна параўнаць з дарослым жыццём. Бо і там, і там шмат выпрабаванняў і разам з тым прыемных падзей. А яшчэ, зразумела, новых знаёмстваў».**


Валянцін Бараноўскі.

Налета ў «Дойлідаў» плануюцца некаторыя змяненні ў пасадах. Цяпер камандзірам будзе студэнт чацвёртага курса інжынера-будаўнічага факультэта Эдуард ЮРОЎСКІ, а камісарам — студэнт таго ж курса механіка-тэхналагічнага факультэта Уладзіслаў КОНАХАЎ.

— Уступіў у будатрад на першым курсе, хацелася атрымаць новыя ўражанні, — кажа Уладзіслаў. — Радавала тое, што гэта ніякім чынам не перашкаджала вучобе, было лёгка сумяшчаць абедзве справы. Летась быў байцом, сёлета атрымаў статус камісара — штогод такія званні выбіраюцца з дапамогай адкрытага галасавання каманды. Мне пашчасціла папрацаваць як на Астравецкай АЭС, так і ў самім горадзе. Галоўнай матывацыяй для сябе лічыў жаданне не падвесці іншых і стаць найлепшым, што ў нас і атрымалася.

Уладзіслаў прызнаецца: яго бацькі першапачаткова здзівіліся, што хлопец зацікавіўся студэнцкім рухам, думалі, што гэта не працягнецца доўга. «Але калі пераканаліся ў сур'ёзных намерах на гэты конт, парадаваліся. Сябры і знаёмыя таксама не разумелі, што там рабіць, аднак праз некаторы час самі з ахвотай уступалі ў розныя атрады».


Уладзіслаў Конахаў.

— Пасля працоўных семестраў наша сяброўства з камандай не заканчваецца, мы збіраемся на выязных мерапрыемствах, наведваем дзіцячыя дамы з канцэртамі, ездзім у прытулак для хатніх жывёл. Аналізуючы, што мне дае такая дзейнасць, разумею: тут з'яўляецца адказнасць перад сабою і іншымі. Таксама раскрываюцца здольнасці і таленты. Сярод нашых байцоў першапачаткова нехта быў сарамлівы, хтосьці — некамунікабельны, але падчас трэцяга семестра гэтыя рысы характару змяніліся ў лепшы бок. Што датычыцца заробку, то такая магчымасць не была для мяне галоўнай мэтай, мы ехалі перш за ўсё па ўражанні. І папрацавалі, і змаглі адпачыць, як бонус — з'явіліся асабістыя грошы, — успамінае суразмоўнік.

Эдуард Юроўскі дзейнасць у будатрадзе распачаў яшчэ


Эдуард Юроўскі.

першакурснікам у якасці байца. І вось цяпер праз тры гады хлопец быў абраны калегамі як камандзір.

**«Можна было паспрабаваць свае сілы ў розных справах, дазвалялася мяняцца зонай адказнасці са сваімі калегамі».**

— Таму пытанне аб тым, ці падабаецца там працаваць, залішняе (*усміхаецца*). Меркавіта для мяне, атрымліваючы такі досвед, было важна развіць сябе творча, адчуць спаборніцкі рух і папрацаваць з карысцю. Зразумела, напачатку было цяжкавата, пасля — значна лягчэй. Дапамагала падтрымка сваякоў і сяброў. Увогуле ўдзел у студатрадах можна параўнаць з дарослым жыццём. Бо і там, і там шмат выпрабаванняў і разам з тым прыемных падзей. А яшчэ, зразумела, новых знаёмстваў, — падзяліўся Эдуард.

Мы ўзаемадзейнічаем не толькі адно з адным у рамках свайго атрада, але і з іншымі. Напрыклад, нядаўна я ўзяў удзел у міжнароднай акцыі «Снежны дэсант» у Омску, быў часткай каманды Міжнароднага атрада снежнага дэсанту «Братэрства». Дарэчы, гэта быў першы раз, калі Беларусь удзельнічала ў ёй. Дзесяць дзён без інтэрнэту і сацыяльных сетак — толькі шчырыя эмоцыі і добрыя справы. Мы выязджалі і ў Казахстан. Прыходзілі на дапамогу ветэранам: прыбіралі снег, дапамагалі па гаспадарцы, таксама ладзілі канцэрты з мясцовымі жыхарамі. Кожны дзень — новае месца. Акрамя таго, штодзень праводзілі лекцыі для школьнікаў, на якіх знаёмілі іх з Беларуссю. У кожнай са школ ладзілі спартыўныя спаборніцтвы. Дарэчы, ва ўсіх месцах, дзе нам удалося згуляць у валейбол, мы займалі першае месца.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*Лакацыі актыўнасці*

## «ВЫБІРАЕМ СТУДАТРАД»

**Акцыя пад такой назвай стартавала ў Беларусі. Галоўная задача праекта — праінфармаваць маладых людзей, студэнтаў ВНУ, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў і старшакласнікаў аб магчымасці папрацаваць у трэцім працоўным семестры ў складзе студэнцкіх атрадаў розных профіляў.**

Мерапрыемствы рэспубліканскай акцыі будуць штотыдзень да чэрвеня праводзіць штабы працоўных спраў пярвічных арганізацый БРСМ, устаноў вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, а да ліпеня — тэрытарыяльныя штабы. Стаць удзельнікам акцыі можа любы ахвотны. Яна будзе напоўнена розным інтэрактывам, аднак нязменнымі застануцца сустрэчы юнакоў і дзяўчат з байцамі студатрадаў, якія падзеляцца сваімі ўражаннямі і эмоцыямі ад работы ў камандзе.

Саюз моладзі ставіць перад сабой мэту яшчэ да пачатку трэцяга працоўнага семестра стварыць базу патэнцыйных удзельнікаў студатрадаўскага руху 2020 года, даведацца пра іх пажаданні, таму падчас акцыі будзе абавязковае анкетаванне — падача своеасаблівай заяўкі для запісу ў студатрад. Дарэчы, сёлета гэта можна зрабіць як падчас мерапрыемства, так і анлайн.

Патэнцыйным удзельнікам руху даецца магчымасць падаць заяўку і праз афіцыйную групу «Беларускі студэнцкі атрад» у сацыяльнай сетцы «УКантакце». Тут змешчана шмат інфармацыі пра работу студэнцкіх атрадаў: будаўнічых, педагагічных, сельскагаспадарчых, сэрвісных, экалагічных, медыцынскіх і вытворчых.

Традыцыйна важнай часткай маладзёжнага праекта таксама з'яўляецца правядзенне дагаворнай кампаніі для арганізацыі работы студэнцкіх атрадаў і пошуку добрасумленных работадаўцаў.

У ліку найбольш знакавых аб'ектаў гэтага года — Усебеларуская маладзёжная будоўля «Горад маладосці» ў Астраўцы, абласныя і Мінская гарадская маладзёжныя будоўлі. У гэтым сезоне сумесна з ЗАТ «Атлант» будзе рэалізаваны Усебеларускі вытворчы працоўны праект з удзелам беларускіх і расійскіх студэнтаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Майстар-клас*

## ХТО ТУТ У КАМУНІКАТАРЫ?

**У БДУ адкрыты прыём заявак на ўдзел у XIII Міжнародным адкрытым студэнцкім форуме. Штогадовае мерапрыемства «PR-кветка — 2020» пройдзе на факультэце журналістыкі з 1 да 3 красавіка. Канцэпцыяй цяперашняга сезона стане «Непатаемнае таварыства камунікатараў».**

Форум прызнаны ўнікальнай пляцоўкай для абмену ідэямі і вопытам паміж абітурыентамі, студэнтамі, прафесіяналамі ў сферы камунікацый і маладымі спецыялістамі з розных краін. У яго рамках удзельнікі даведаюцца пра тэндэнцыі ў карпаратыўных стратэгічных камунікацыях, прэзентуюць вырашэнні актуальных прафесійных задач.

Для ўдзелу неабходна запоўніць электронную заяўку да 15 сакавіка ўключна і выслаць кароткае апісанне сваёй работы ў адной з секцый: «Камерцыйныя праекты», «Некамерцыйныя (сацыяльныя) праекты». Удзельнічаць у форуме можна як індывідуальна, так і ў складзе каманды да шасці чалавек. Запрашаюцца таксама старшакласнікі, якія дасягнулі ўзросту 16 гадоў.

З падрабязнай інфармацыяй аб мерапрыемстве і патрабаваннямі да афармлення праектаў можна азнаёміцца на сайце http://prkvetka.bsu.by.

Арганізатарам форуму выступае кафедра тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю факультэта журналістыкі, суарганізатар — кансалтынгавая кампанія IPR Belarus.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
12 03 2020 г.

*Бачыць мэту*

# БЫЦЬ ДОБРЫМ ДОКТАРАМ І ЧАЛАВЕКАМ

**У дзяцінстве ўсе мы марым пра нейкую незвычайную прафесію: касманаўта, шкловыдзімальшчы, балерыны... Вельмі часта з цягам часу нашы планы змяняюцца: разбіваюцца аб «вострыя скалы» дарослага жыцця або проста ўступаюць месца іншым інтарэсам. І тое, што здавалася прызваннем раней, у сталага чалавека часта выклікае толькі ўсмешку. Але так бывае не ў кожнага. Прыклад — гісторыя Дар'і ЮХНІК. Так-так, яна тое самае «дзіця, якое стала касманаўтам».**

Мама дзяўчыны — Ніна Іванаўна — мае медыцынскую адукацыю. Яна скончыла Мінскі каледж па спецыяльнасці «медыкадыягнастычная справа». Па яе словах, Дашы з самага маленства падабалася слухаць пра тое, як працуе арганізм чалавека. Замест казак на ноч яна апавядала свайму дзіцяці аб складаных біялагічных працэсах. А калі дзяўчынка падрасла, маці пачала браць дапытлівую дачку з сабой на работу — у лабараторыю Смалявіцкай раённай паліклінікі.

— Мне заўсёды было цікава разглядаць пад мікраскопам пазногаць, лісцік, волас... Што заўгодна! Магла злавіць муху і вывучаць яе. Назірала за работай маці. Круціла ў руках шкельцы для аналізаў. Было жаданне зразумець усё. Пасля таго як разабралася з аналізамі, папрасілася ў кабінет да знаёмага стаматолага. Там навучылася рыхтаваць пломбы, — прыгадвае суразмоўніца.

Падчас вучобы ў пачатковай школе на пытанне «Кім хочаш стаць, калі вырасцеш?» Дар'я заўсёды адказвала, што доктарам. Аднойчы здарылася сітуацыя, якая стала сапраўднай праверкай на трываласць дзіцячай мары.

— Калі была ў дзявятым класе, неяк увечары да нас забегла суседка і паклікала маю маму. Крычала, што яе сяброўцы дрэнна: тая страціла прытомнасць, нават не дыхае! Удакладніла, што ў жанчыны цукровы дыябет. А мама была хворая ў той момант, зусім слабая, не магла нават устаць з ложка. Разумеючы гэта, сказала: «Я пайду». Што магла тады зрабіць? Не ведаю. Але ў сваіх сілах была ўпэўненая. Вельмі хутка



апынулася ў суседкі. Адразу падумала, што гэта гіпаглікемічная кома: цукру ў арганізме недастаткова, і жанчына «адключылася». Каля яе рота была пена, пачаліся сутаргі...



Спужалася, што чалавек можа памерці, а я побач і нічым не магу дапамагчы. Але ж узяла сябе ў рукі, знайшла глюкометр і праверыла цукар у крыві. Пачуццё мяне не падманула: яго было крытычна мала. Адразу злётала на кухню і назад, засунула жанчыне кавалачак цукру пад язык. Праз некаторы час прыехала хуткая дапамога, яе забралі ў стацыянар. А я вярнулася дадому і была вельмі рада, што ў патрэбны момант не разгубілася, што ў мяне атрымалася чымсьці дапамагчы. І менавіта тады канчаткова пераканалася, што хачу быць доктарам, — працягвае Дар'я.

Дзяўчына прызнаецца, што з таго часу паступіць у Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт стала яе марай. І ўсё атрымалася. Цяпер яна — студэнтка чацвёртага курса лячэбнага факультэта БДМУ. Будучы доктар праходзіла практыку ў Смалявіцкай цэнтральнай раённай бальніцы, працавала там медсястрой на працягу некалькіх месяцаў.

Размяркоўвацца Дар'я будзе таксама ў родны раён, бо паступала па мэтавым накіраванні. Цікаўлюся, доктарам якой спецыялізацыі жадае быць дзяўчына.

— Разглядаю варыянт з гінекалогіяй. Па сваім досведзе ведаю, што дактары гэтага профілю пры ўзаемадзеянні з пацыентамі часта робяць памылкі, якія перашкаджаюць тым адчуваць сябе камфортна. А да дзяўчат, якія толькі становяцца жанчынамі, трэба знайсці індывідуальны падыход, быць не толькі прафесійнай, але і спагадлівай, абыходлівай, — кажа суразмоўніца. — Спадзяюся, што ў мяне атрымаецца выклікаць іх давер. А яшчэ я вельмі люблю навуку і працаваць з людзьмі, таму як «план Б» разглядаю сумяшчэнне медыцынскай практыкі з выкладаннем ва ўніверсітэце.

На пытанне, да чаго Дар'я будзе імкнуцца, калі яе жаданне стаць доктарам здзейсніцца, яна адказвае:

— Быць не толькі добрым урачом, але яшчэ і такім жа чалавекам. Гэта справа і мара ўсяго майго жыцця.

**Паліна ПРАКАПЕНЯ,**
**студэнтка II курса факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота з архіва гераіні.**

*Расправіць крылы*

# «ВАЕННАЯ ТЭМА НЕ ЧУЖАЯ З ДЗЯЦІНСТВА»

**Трэцякурсніца Ваеннай акадэміі Яўгенія ЛЕВІКІНА рушыць стэрэатыпы. Дзяўчына ўжо праз паўтара года стане дыпламаваным спецыялістам па кіраванні авіяцыйнымі і радыёэлектроннымі сістэмамі. Увесь час яна вучыцца на «выдатна», атрымала стыпендыю Прэзідэнта і была ўганаравана міжвузаўскім тытулам «Міс Вясна». А яшчэ займаецца навуковымі распрацоўкамі, спортам і пакідае час для творчасці... Як жа ўсё гэта ўдаецца рабіць, калі ў сутках толькі 24 гадзіны?**



— Калі яшчэ вучылася ў школе, выпадкова ўбачыла фота сваёй знаёмай з Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча. Здымак быў зроблены падчас балю. Мне спадабалася тое, як выглядалі ў форме хлопцы і дзяўчаты, — прыгадвае суразмоўніца.

Сама Яўгенія родам з Асіповіч. Вайсковая часць знаходзіцца каля дома. Калісьці там служыў бацька курсанткі, таму яшчэ з маленства ваенная тэма была не чужая. А пакрысе стала і сваёй. Але, як згадвае дзяўчына, спярша да яе выбару ў выглядзе авіяцыі некаторыя родныя і блізкія паставіліся з насцярогай. І толькі пасля паспяховага паступлення меркаванне змянілася.

Яўгенія скончыла Мінскае абласное кадэцкае вучылішча з высокім сярэднім балам — 8,6. У атэстаце не было ніводнай адзнакі, ніжэйшай за «сем». Гэта дало права паступаць у Ваенную акадэмію без здачы цэнтралізаванага тэсціравання. Але два выпрабаванні ўсё ж такі засталіся: псіхалагічны тэст і здача нарматываў па фізічнай падрыхтоўцы. Трэба было прабегчы на хуткасць сто метраў, кіламетр і пэўную колькасць разоў падняць тулава. Вось на гэтым і зрэзалася большасць прэтэндэнтак. У суразмоўніцы ж асаблівых праблем не ўзнікла: Яўгенія калісьці займалася многімі відамі спорту — жаночым футболам, баскетболам, бегам... Але кажа, што нідзе сябе не знайшла. Хоць на аматарскім узроўні займаецца і цяпер, каб падтрымліваць форму.

— Мне засталося вучыцца крыху больш за год, — дзеліцца дзяўчына. — Пасля я стану інжынерам-спецыялістам па кіраванні авіяцыйнымі і радыёэлектроннымі сістэмамі. Гэта значыць, што мяне могуць накіраваць у эскадрыллю або тэхніка-эксплуатацыйную часць: праводзіць рэгламентныя работы, абслугоўваць і рамантаваць абсталяванне. Яшчэ варыянт — працягнуць навучанне ў магістратуры. У нас ужо была практыка ў 116-й гвардзейскай штурмавой авіяцыйнай базе ў Лідзе. Там сфарміравана эскадрылля з самалётаў Як-130. Падчас заняткаў мы вывучалі наземнае абсталяванне, якое там эксплуатуецца. Вялікая стажыроўка пачнецца ў канцы чацвёртага курса, і падчас яе мы будзем наведваць кожную авіяцыйную часць Беларусі.

**«Пасля страявога кроку прайсці дэфіле вельмі складана. Зноў жа, трэба было навучыцца хадзіць на абцасах».**



У 2018 годзе Яўгенія ўдзельнічала ў міжвузаўскім конкурсе «Каралева Вясна». Тагачасная першакурсніца перамагла па меркаванні інтэрнэт-карыстальнікаў.

— Папярэдні адборачны тур прайшоў у Ваеннай акадэміі. Я яго выйграла, і мне прапанавалі паўдзельнічаць у гарадскім этапе. Днямі хадзіла на трэніроўкі, а вучобу «наганяла» ўвечары. Пасля страявога кроку прайсці дэфіле вельмі складана. Зноў жа, трэба было навучыцца хадзіць на абцасах. Самыя высокія з іх былі 14 сантыметраў. Яшчэ кожная канкурсантка мусіла выступіць з асабістым нумарам. Разам з падтанцоўкай я выканала песню на ваенную тэматыку. Карыстальнікі сеціва маглі ацаніць візітоўку — невялікі відэасюжэт, выкладзены ў інтэрнэце. Там я выступала ў ролі пілота, які праляцеў над сваім родным горадам і апавядаў пра ўласныя адчуванні ад гэтага.

Яўгенія з шасці гадоў хадзіла ў музычную школу, дзе вучылася эстраднаму вакалу. Але прафесійна ім ніколі не займалася. Разам з тым яна спявае паўсюль, дзе вучыцца, — у школе, вучылішчы і Акадэміі. А яшчэ дзяўчына піша музыку. Нядаўна тая гучала на конкурсе армейскай песні «Зорка», дзе наша гераіня разам з іншым курсантам выканала песню.

Але як жа дзяўчыне ўдаецца ўсё паспяваць?

— Проста трэба ўсё планаваць загадзя. І не цурацца дапамогі, калі яна сапраўды неабходна. Напрыклад, я жыву ў інтэрнаце ў адным пакоі разам з трыма аднакурсніцамі. І ўсе яны — выдатніцы з бязлічу захапленняў, — кажа наша гераіня.

**«Вялікая стажыроўка пачнецца ў канцы чацвёртага курса, і падчас яе мы будзем наведваць кожную авіяцыйную часць Беларусі».**

А неўзабаве ў Яўгеніі пачынаюцца трэніроўкі да парада на Дзень Перамогі.

— Гэта будзе ўжо мой трэці парад. Калі я была на першым курсе, то ўпершыню была сфарміравана жаночая «каробка». 150 чалавек сабралі з усёй краіны. Было вельмі складана. Звычайна праходзяць дзве трэніроўкі за дзень. Пачынаюцца яны прыблізна за два месяцы і адбываюцца штодня, акрамя суботы і нядзелі. І вось што самае дзіўнае — на самім парадзе хвалюешся не так, як на трэніроўцы! — прызнаецца дзяўчына.

...Напрыканцы размовы заўважаем, што каля ложка стаіць фотаздымак у рамцы. Дзякуючы вучобе ў кадэцкім вучылішчы наша гераіня сустрэла сваё каханне. Яўген быў намеснікам камандзіра яе ўзвода. Таксама паступаў у Ваенную акадэмію, але не прайшоў па медыцынскіх паказчыках. Цяпер атрымлівае эканамічную адукацыю ў БДУ. І амаль кожны вечар стараецца прыязджаць да Яўгеніі...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

# ВАШЫ ІДЭІ, ДЗЯРЖАВЫ – ПАДТРЫМКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Ідэя вучня дзясятага класа сталічнай гімназіі № 38 Арсенія ЖЫЛКІ на першы погляд гучыць мудрагеліста: біяпалімерныя 3D-скафалды на аснове пекціну і хітазану для выкарыстання ў медыцыне, касметалогіі і стаматалогіі. Але паспрабуем разабрацца з гэтым з дапамогай самога аўтара.

— Сучасныя тканінныя пакрыцці для ран на аснове сінтэтычных матэрыялаў эфектыўныя, аднак яны шкодзяць экалогіі. Мы вырашылі стварыць альтэрнатыву, выкарыстоўваючы прыродныя патэнцыял, — растлумачыў юнак. — Скафалд — гэта высакапорыстае тканіннае пакрыццё, пекцін змяшчаецца ў яблыках, а крыніца хітазану — грыбы або насякомыя. У саставе няма антыбіётыкаў, што робіць нашу распрацоўку цалкам бяспечнай. Калі ў чалавека ёсць паверхневая рана, ён можа прыкласці да яе наш скафалд, і ў хуткім часе адбудзецца загойванне, клеткі самастойна аднавяцца. Для нас было важна, каб навінка была біяраскладальная. Адзін від пакрыцця разбураецца праз пяць гадзін, другі — праз дзесяць сутак. Такім чынам, ніякай шкоды экалогіі. Акрамя таго, прэзентаваныя скафалды танныя: прыкладны сабекошт за штуку — каля 20 капеек.

Без увагі прысутных не абышлася распрацоўка малодшага навуковага супрацоўніка і аспіранткі Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Ганны КАРПЕНКА. Дзяўчына прадставіла магчымую методыку для стварэння лекаў ад каранавіруса COVID-19.

— Праект мае назву «Рацыянальны дызайн антыВІЧ-прэпаратаў», але ў сувязі з трывожнымі навінамі пра распаўсюджанне каранавіруса мы не засталіся ўбаку ад гэтай сусветнай праблемы. У канцы лютага кітайскія спецыялісты апублікавалі рэнтгенаўскую мадэль клеткі-мішэні, і мы адразу прыступілі да новых даследаванняў. Знайшлі злучэнне, якое можа патэнцыйна з'яўляцца лекавым прэпаратам ад каранавіруса. Зразумела, прайшло няшмат часу, але мяркуем, што распрацаваная намі методыка для ВІЧ зможа дапамагчы многім і па гэтай праблеме. Цяпер мы ўзаемадзей-



Ганна Карпенка.

нічаем з кітайскімі навукоўцамі і працягваем працаваць у гэтым кірунку, — падзялілася Ганна.

Цікавы праект прадставіў вучань дзясятага класа мінскай сярэдняй школы № 111 Максім СУВОРАЎ.

— Мы з маім настаўнікам Мікалаем Юр'евічам Курыловічам два гады таму распрацавалі мабільную прыладу з элементамі дапоўненай рэальнасці «Мова ці кава? Мова цікава!», куды ўваходзяць праграмы «ДНК» і «Арфаграфічная вясёлка». Першая прызначана для вучняў старшых класаў, другая — для пачатковых і сярэдніх, — расказаў аўтар. — Для чаго яны патрэбны? Па-першае, каб палепшыць арфаграфічную пільнасць, што карысна для ўсіх, а таксама добра падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання, што найбольш актуальна для дзясятых і адзінаццатых класаў. Напрыклад, у «Арфаграфічнай вясёлцы» ёсць як тэкставыя заданні, так і аўдыяфайлы. Мы шмат часу думалі над яе афармленнем, каб дзецям было цікава атрымліваць веды праз праграму. Сем колераў вясёлкі — сем тэматычных блокаў у трэнажоры. Нават стварылі персанажаў: піянер Васіль адказвае за спалучэнне галосных -ія, -ыя, Вясёлка — за правапіс -э, -ё, -ю, -я. Акрамя мабільнага памочніка па правапісе ў хуткім часе плануем пашырыць дыяпазон і стварыць такі ж па сінтаксісе і пунктуацыі. Ганарымся, што дапамагаем вучням замацоўваць веды па беларускай мове і развіваць цікавасць да роднага слова, — падкрэсліў Максім.



Караліна Багдановіч і Наталля Гром (*у цэнтры*).

— Мая функцыя была ў тым, каб сістэматызаваць матэрыял, — дадаў Мікалай Курыловіч. — Не кожны пойдзе ў бібліятэку і возьме, напрыклад, каля васьмі-дзевяці кніг для падрыхтоўкі да ЦТ, бо гэта цяжка несці як мінімум. А наш дапаможнік аблягчае працу ўсім. Мы ўжо тэсціравалі распрацоўку на вучнях розных класаў і можам сказаць, што гэта выдатна працуе. Праграма робіць выкладанне беларускай мовы сучасным і вучні з задавальненнем ідуць на ўрокі. Што можа здзівіць: такой прыладай захапляюцца як дзеці, так і дарослыя. Бо арфаграфія, правільнае напісанне — гэта ж заўсёды важна. У любой сітуацыі трэба памятаць пра родную мову.

Сферу харчавання закранула, прэзентуючы свой праект, студэнтка чацвёртага курса Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Дар'я ПАЎЛОЎСКАЯ. Дзяўчына стварыла фудбоксы, у якіх змяшчаюцца інградыенты для прыгатавання беларускіх нацыянальных страў.

— Ідэя ўзнікла сёлета, падчас чарговай паездкі да сяброў у Турцыю. Яны вельмі хвалілі прыгатаваныя мною дранікі і прасілі, каб я навучыла іх рабіць такія ж. Калі вярнулася на радзіму, зразумела, што магу фарміраваць наборы з мінімальнай колькасцю прадуктаў для стварэння асабістых «шэдэўраў». Так з'явіліся боксы для кісялю і дранікаў. Мне было важна праз іх паказаць, што наша кухня адрозніваецца ад той жа рускай ці ўкраінскай, што ў нас асаблівыя стравы. Планую і далей эксперыментаваць, бо ежа — гэта таксама частка Беларусі, і нам ёсць чым ганарыцца.

Цікавасць выклікаў і праект Qesterland другакурсніц факультэта педагогікі і псіхалогіі БарДУ Дар'і ДАБРЫНЕЎСКАЙ і Вольгі ЦЯЛЬПУК. Ён уяўляе сабой гістарычныя і разам з тым адукацыйныя квэсты для дзяцей, падлеткаў і моладзі. «Іх асноўная мэта — арганізаваць вольны час маладых жыхароў сельскай мясцовасці. Чым старэйшыя ўдзельнікі, тым больш складаныя будуць заданні. Цяпер распрацаваны два квэсты — напрыклад, першы прысвечаны дваранскаму роду Рэйтанаў і праходзіць у вёсцы Грушаўка Ляхавіцкага раёна. З дапамогай нашых вандровак можна добра адпачыць, а таксама даведацца пра значныя для краіны гістарычныя падзеі. Прычым усё гэта будзе бясплатна», — падзяліліся дзяўчаты.



Дар'я Паўлоўская.

Удзельніцы праекта «Лялька.Бай» васьмікласніца Ксенія ХАХОЛКА і дзесяцікласніца Аксана РУДАК з Глыбокага захоўваюць традыцыі Беларусі праз дзіцячыя лялькі, якіх яны пачалі ствараць усяго год таму. Тыя размаўляюць і спяваюць на роднай мове, а таксама расказваюць казкі і калыханкі. Гэта спрыяе развіццю ў дзяцей музычнага слыху і творчых здольнасцяў.

— Ідэя ў тым, каб прывіць ім любоў да роднай культуры, да нацыянальнага фальклору. Нашы лялькі размаўляюць пры дапа-



Арсеній Жылка.

мозе партатыўнай калонкі, якая знаходзіцца ўнутры і працуе праз «Блютуз». Напрыклад, мама гатуе на кухні. Каб заняць у гэты час дзіця, яна можа знайсці ў інтэрнэце любы развіваючы матэрыял на беларускай мове і ўключыць малому. Сплюша і Весялінка спяваюць, а дзед Баюн апавядае казкі. На стварэнне адной лялькі сыходзіць тыдзень. Каб зразумець, ці прымуць такія забавы хлопчыкі і дзяўчынкі, мы прапанавалі іх у дзіцячым садзе, усім яны вельмі спадабаліся, — растлумачыла кіраўнік творчай групы Аксана ШПАКАВА.

Распрацоўшчыкі лічаць, што іх лялькі могуць стаць нацыянальным брэндам. «У нас у горадзе штогод праходзіць міжнародны «Вішнёвы фестываль», на якім госці з больш чым 11 краін хочуць набыць сабе падарунак, які будзе нагадваць пра Беларусь. І якраз наш праект гэтаму дапамагае, лялькі карыстаюцца папулярнасцю».

Галоўнай фішкай дзявятага сезона конкурсу «100 ідэй для Беларусі» стала экалагічная тэматыка. Гэты кірунак падхапілі прадстаўнікі школьнай бізнес-кампаніі з Зэльвы Караліна БАГДАНОВІЧ і Наталля ГРОМ, аўтары праекта ZNOVA.

— Па назіраннях мясцовых жыхароў, на берагах водных аб'ектаў вельмі шмат трысняговых зараснікаў, таму патрабуюцца ачысткі. Перад тым як гэтым заняцца, было ўзнята пытанне: ці ўплывае збор сухога трыснягу на экалогію. Аказалася, што гэта абсалютна бясшкодна. Нарыхтоўваем сыравіну восенню на працягу года працуем з ёй, — расказала Наталля.

— Лічу, што трыснёг — гэта золата Беларусі, і, што дзіўна, мала хто пра гэта ведае, — падхапіла Караліна. — Напачатку мы распрацавалі методыку вырабу паперы з сабранай сыравіны, паспрабавалі самі ў дамашніх умовах, і калі ўсё выйшла, паказалі вытворчы працэс дзецям на ўроках. Многія зацікавіліся, у тым ліку і іх бацькі. Атрымлівалася, што кожны можа асвоіць такую справу. Дарэчы, адходаў ад трысняга амаль няма. Апрацоўка расліны займае прыкладна паўтары гадзіны. За дзень можна зрабіць каля 50 аркушаў паперы. Калі браць звычайныя крафтавыя пакеты, то тлустыя прадукты ў іх змакаюць, у нашым выпадку — не. На сёння мы навучыліся вырабляць паперу рознай таўшчыні і колеру. Рэалізуем паштоўкі, палотны для мастакоў, упакоўкі для падарункаў, падстаўкі пад напоі, пакеты, вялікія скрынкі і кубачкі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**
**Матэрыял цалкам і больш фота — на сайце zviazda.by**

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: ЧТТУП «ТОРГИМПЕКС ЗАПАД» (УНП 691425494), 222720, Минская обл., г. Дзержинск, ул. 1-я Ленинская, д. 43, комн. 201.

Публичные торги в электронной форме будут проведены 13 апреля 2020 г. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов – **седельный тягач Renault Premium 450, 2008 г. в., цвет зеленый, № рамы VF624GPA000026290, с полуприцепом бортовым SCHMITZ SPR 24, 2008 г. в., цвет серый, серебристый, № рамы WSM00000003093043 (б/у).** Начальная цена предмета торгов – 45 000,00 бел. руб. с НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Местонахождение: г. Минск, пер. Асаналиева, 5, тел. для ознакомления +37529 698-53-18.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 12.03.2020 г. 09.00 по 10.04.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном аукционе

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 422/С-58279 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание мясного павильона центрального рынка), площадью 161,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 22А.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100002001238, площадью 0,3255 га (назначение – для обслуживания здания мясного павильона центрального рынка) по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 22А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0032 га

Начальная цена продажи – 28 000 р. (двадцать восемь тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 1400 р. (одна тысяча четыреста рублей)

Продавец – Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26. Тел. (801514) 28-1-50

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб.209, тел.: 55-87-70, 55-87-71

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 13 апреля 2020 г. в 10.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Пушкина, 26**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 18.09.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 09 апреля 2020 г. до 15.00**

***Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»***
https://grino.by/aukcion/

БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### по продаже изолированного помещения

**Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества –** Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк».

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | Капитальное строение (гараж) с инвентарным номером 710/С-76070, расположенное по адресу: Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Пролетарская, 31А, общей площадью 42 кв. м, год постройки – 1993 |
| **Начальная цена продажи** | 13 230,00 (Тринадцать тысяч двести тридцать белорусских рублей 00 копеек), в т. ч. НДС 20 % – 2205,00 |
| **Сумма задатка** | 661,50 (Шестьсот шестьдесят один белорусский рубль 50 копеек) – 5 % |
| **Открытый аукцион состоится** | 14.04.2020 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 10.04.2020 включительно по адресу: г. Могилев, ул. 30 лет Победы, д. 3, второй этаж, кабинет 209 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: (8-0222)-403122, моб. 8029-169-39-68 |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 661,50 белорусского рубля на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2x в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

**К заявлению также прилагаются:**

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 32);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Заключительная регистрация участников аукциона – 14 апреля 2020 г. с 10.15 до 10.45. Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 15 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

**Организатор торгов ЗАО «Белреализация» уведомляет,** что назначенные на 17.03.2020 г. электронные торги по продаже имущества ООО «Апрель Сити» (УНП 191197208) по лотам «Изолированное помещение с инв. № 500/D-708107084, квартира 1» и «Изолированное помещение с инв. № 500/D-708107086, квартира 3» по адресу: г. Минск, ул. Севастопольская, 57, **отменены.** ***Извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 15.02.2020 г. и на BELTORGI.BY.***

## Информационное извещение о проведении Ивацевичским районным исполнительным комитетом открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка

Характеристика земельного участка, выставляемого на аукцион

| | |
|---|---|
| **Местонахождение (адрес земельного участка)** | Брестская область, г. п. Телеханы, улица Механизаторов, 14 |
| **Площадь участка, га** | 0,2483 |
| **Виды земель** | земли под застройкой |
| **Вещное право на земельный участок** | аренда сроком на 50 (пятьдесят) лет |
| **Целевое назначение земельного участка (назначение участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества)** | для строительства и обслуживания мини-пекарни с магазином непродовольственных товаров (для размещения объектов иного назначения, код 11600) |
| **Кадастровый номер участка** | 123485590601001736 |
| **Начальная (стартовая) цена земельного участка, рублей** | 10 624,04 рубля (десять тысяч шестьсот двадцать четыре рубля четыре копейки) |
| **Наличие инженерных коммуникаций на прилегающей территории** | сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения, водоотведения, связи |
| **Состояние дорожной сети улиц** | с асфальтированным покрытием |
| **Ограничения в использовании** | на площади 0,0020 га в охранных зонах линий связи и радиофикации |

**Аукцион состоится 15 апреля 2020 года в 15.00** в малом зале райисполкома по адресу: Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, д. 44, каб. 116.

Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели или юридические лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) представляют комиссии следующие документы:

заявление об участии в аукционе;

копия платежного поручения с отметкой банка о внесении суммы залога за участие в аукционе в размере 2000.00 руб. (две тысячи рублей 00 копеек) на р/с № BY72AKBB36411006500341300000 в ЦБУ № 111 филиала № 802 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Барановичи, БИК AKBBBY21802, получатель платежа – Ивацевичский райисполком, УНП 200100489;

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

а также заключает с исполкомом соглашение.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц, индивидуальные предприниматели предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится при условии наличия не менее двух участников аукциона.

Предоставление земельного участка в аренду победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона производится с условиями:

внесения платы за предмет аукциона;

возмещения Ивацевичскому райисполкому затрат на организацию и проведение аукциона в размере 2297,57 руб. (две тысячи двести девяносто семь рублей 57 копеек) в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протоколов о результатах аукциона;

заключения (в течение 2 рабочих дней после внесения платы за предмет аукциона, возмещения расходов по организации и проведению аукциона) победителем аукциона либо единственным участников несостоявшегося аукциона с Ивацевичским райисполкомом договора аренды земельного участка и обращения в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды за государственной регистрацией прав на земельный участок;

получения архитектурно-планировочного задания и технических условий на инженерно-техническое обеспечение объекта в месячный срок со дня государственной регистрации права на земельный участок;

разработки и утверждения проектной документации на объект в срок, не превышающий двух лет со дня государственной регистрации права на земельный участок;

занятия земельного участка (начала строительства) в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на объект;

снятия на земельном участке плодородного слоя почвы из-под пятен застройки и использования в соответствии с проектной документацией на строительство объекта;

строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией на него;

возврата земельного участка в состав земель г. п. Телеханы по окончании срока аренды земельного участка или заключения договора аренды на новый срок.

Результаты аукциона оформляются протоколом, копия которого выдается победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в день проведения аукциона, либо в день признания аукциона несостоявшимся.

Предварительное ознакомление с земельным участком на местности проводится при подаче заявления.

**Заявления на участие в аукционе принимаются с 16 марта 2020 г. по адресу:** 225291, Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, 44, каб. 405, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 13 апреля 2020 года включительно.

**Контактные телефоны в г. Ивацевичи: (801645) 9-13-69, 2-54-76, 3-00-94.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Вид аукциона | Характеристика инженерных коммуникаций | Площадь земельного участка, га | Назначение участка | Условия продажи | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по формированию и регистрации земельного участка, проведению аукциона (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Клецк, ул. Высокая, 30, 622550100002003392 | Продажа в частную собственность гражданам РБ | Водопровод, электроснабжение, газоснабжение, асфальтированный подъезд, центральная канализация | 0,1050 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Осуществление в двухмесячный срок государственной регистрации прав на земельный участок после подписания протокола аукциона; получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство; занятие (освоение) земельного участка не позднее 1 года после получения свидетельства о государственной регистрации участка | 5000 | 500 | 1822,86 |

1. Аукцион состоится **14 апреля 2020 г. в 11 часов** в здании Клецкого райисполкома по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, каб. 420.

2. Для участия в аукционе граждане подают заявление об участии в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, представляют документ подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении с отметкой банка, представляется копия паспорта, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 8.00 до 17.00** по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, кабинет 204; последний день приема документов 13 апреля 2020 г. до 11.00. Заключительная регистрация участников **14 апреля 2020 г. с 10.00 до 10.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. **Сумма задатка перечисляется на расчетный счет BY 38 AKBB 3641 2074 3071 0650 0000 в ЦБУ № 607 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Клецке, БИК AKBBBY2X. Получатель – Клецкий райисполком УНП 600198162, ОКПО 04064631.**

5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее **10 рабочих дней** со дня утверждения протокола аукциона внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка, затраты на подготовку и проведение аукциона.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомится с объектом продажи. **Контактные телефоны в Клецке (8-01793), 68211 сайт: www.kletsk.minsk-region.by/ru**

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»** (организатор аукциона)
**по поручению Республиканского дочернего унитарного предприятия «Белоруснефть-Транс»** (продавец)
**извещает о проведении 30 апреля 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Грузовой седельный тягач MAZ 643019 1420-020** (рег. знак № АМ 1442-3), инвентарный номер № 170087 (по бух. учету), год выпуска – 2014-й. ТС к дальнейшей эксплуатации не пригодно. Автомобиль имеет существенные эксплуатационные дефекты и повреждения в результате ДТП. Общее состояние автомобиля – неудовлетворительное. **Местонахождение:** Минская область, Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 9Б | **54 471,67** | 5 447,17 |

**Продавец: Государственное предприятие «Белоруснефть-Транс»,** ул. Книжная, 15Б, 246003, г. Гомель, Республика Беларусь. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8(029)249-56-43. Инженер транспортного цеха – Терещенко Павел Александрович. **Шаг аукциона – 5 %.** Для участия в аукционе необходимо: 1) оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Республиканское дочернее унитарное предприятие «Белоруснефть-Транс»):** УНП 491317683, IBAN BY34 BPSB 3012 1728 2601 1933 0000, BIC (SWIFT) банка BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, назначение платежа – **задаток за участие в аукционе за лот №** (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2) подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 12 марта 2020 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 29 апреля 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником,** объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)». **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8 (029)126-66-62.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона., бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1. Предприятие как имущественный комплекс ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» (регистрационный номер 0001403, свидетельство № 3343 от 04.04.2018 г.) с учетом изменений (свидетельство № 3465 от 28.05.2019 г.).<br>2. Одноэтажный производственный корпус завода сухих смесей, инв. № 630/С-45494.<br>3. Административное помещение № 1, инв. № 630/D-45450 | Минская обл. Молодечненский р-н, Чистинский с/с вблизи п. Чисть 1/24, 1/25-1 | 1 398 960,00 | 139 896,00 | 69 948,00 |
| 2 | 1. Предприятие как имущественный комплекс ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» (регистрационный номер 0001404, свидетельство № 3344 от 06.04.2018 г.) с учетом изменений (свидетельство № 3464 от 28.05.2019 г.).<br>2. Трансформаторная завода черепицы, инв. № 630/С-37720.<br>3. Одноэтажное здание склада хранения черепицы, поддонов, инв. № 630/С-37719.<br>4. Проходная, инв. № 630/С-37716.<br>5. Здание производственного цеха растворимых красок, инв. № 630/С-43640.<br>6. Смесительная установка, инв. № 630/С-37711.<br>7. Конвейерная эстакада завода черепицы, инв. № 630/С-37714.<br>8. Производственный цех завода черепицы с бойлерной, инв. № 630/С-37710.<br>9. Двухэтажный кирпичный административно-бытовой корпус завода черепицы, инв. № 630/С-37717 | Минская обл. Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 6/4, 6/7, 6/1, 6/2, 6/5, 6/8, 6/3, 6 | 3 511 512,00 | 351 151,20 | 175 575,60 |
| 3 | Линия производства тротуарной плитки, инв. № 7200077 | Минская обл. Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть | 365 040,00 (с НДС) | 36 504,00 (с НДС) | 18 252,00 (с НДС) |
| 4 | Установка полуавтоматическая, инв. № 96001593 | Минская обл. Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть | 11 340,00 (с НДС) | 1 134,00 (с НДС) | 567,00 (с НДС) |
| 5 | Установка полуавтоматическая, инв. № 96001752 | Минская обл. Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть | 21 600,00 (с НДС) | 2 160,00 (с НДС) | 1 080,00 (с НДС) |
| 6 | Автономная линия установки тротуарной плитки, инв. № 72000785 | Минская обл. Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть | 295 920,00 (с НДС) | 29 592,00 (с НДС) | 14 796,00 (с НДС) |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые повторные торги. Публикации об аукционе ранее размещались в газете «Звязда» № 166 от 03.09.2019 г.

Окончание приема заявлений **в 16.00 07.04.2020.**

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 623886007601000757 площадью 50,9873 га, право постоянного пользования, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений, категория земель – земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения. Земельный участок имеет ограничения: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2 площадь – 2,9281 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах объектов газораспределительной системы, код – 5,7, площадь – 4,8900 га.

Лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым номером 623886007601000757 площадью 50,9873 га, право постоянного пользования, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений, категория земель – земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения. Земельный участок имеет ограничения: земельные участки расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 2,9281 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах объектов газораспределительной системы, код – 5,7, площадь 4,8900 га. И на земельном участке с кадастровым номером 623886007699000012, площадь – 4,7565 га, право постоянного пользования, целевое назначение – для содержания и обслуживания зданий и сооружений завода кровельной черепицы д. Чисть, категория земель – земли населенных пунктов, садоводческих товариществ и дачного кооператива. Земельный участок имеет ограничения: земельные участки, расположеные в охранных зонах водопровода, код – 4, площадь – 0,1138 га; в охранных зонах канализации, код – 7, площадь – 0,1261 га.

Условия

Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе и он согласен приобрести Предмет (Предметы) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Предмета (Предметов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Предмета (Предметов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста – 5 % от начальной цены предмета торгов.**

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион по лотам состоится 08.04.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by.

До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344.

Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» (Лот №__), проводимом __.__.2019 г.»

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами аукциона. Контактное лицо для осмотра Предметов: 8 029 303 18 05 (Новоселов Дмитрий Викторович).

По вопросам наличия обременений на вышеуказанные лоты обращаться по телефону 8 (029) 171 09 46 (Кибзюк Дмитрий Николаевич).

Дополнительная информация по предмету торгов по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

**Государственная регистрация договора купли-продажи, предприятия как имущественного комплекса и объектов недвижимости, входящих в его состав, осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.**

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 305 86 50 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by |
| **Продавец** | ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» в лице антикризисного управляющего ООО «Партнер-консультант» ☎ +375 (29) 698-51-76, +375 (29) 502-77-77, +375 (29) 392-89-06, +375 (17) 395-58-13 |

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторных электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | ОАО «МИЛКАВИТА», г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф.4б |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Объекты недвижимости**

**Лот № 1**
**(имущество реализуется одним лотом)**

**Производственная база** в составе: **бытовые помещения** (340/С-293597, 58,5 кв. м), **здание конторы** (340/С-293567, 52,2 кв. м), **склад** (340/С-293569, 115,9 кв. м), **здание производственного корпуса** (340/С-293570, 267,5 кв. м, составные части: два забора, трое ворот, асфальтное покрытие), **котельная** 340/С-293568, 100,2 кв. м, составные части: труба дымовая (h = 24 м), емкости для топлива 2 шт. по 6 куб. м), **гараж** (340/С-293565, 82,3 кв. м).

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу пл. 0,3603 га на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений молочного завода. Ограничения (обременения): находится в водоохранных зонах.

Местоположение – **Гомельская обл., г. Лоев, ул. Царикова, д. 39**

***Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 57 780,00 бел. руб. (снижена на 55 %)***

**Лот № 2**

**Квартира** (расположена в пятиэтажном жилом доме 2010 г. п. на 4 этаже и состоит из двух жилых комнат, 340/D-219285; 66,5 кв. м).

Месторасположение – **Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Карла Маркса, 25-16**

***Начальная стоимость лота № 2 без НДС – 55 275,00 бел. руб. (снижена на 25 %)***

***Транспортные средства, оборудование, бывшие в употреблении***

Местонахождение: г. Гомель, ул. Братьев Лизюковых, 1

| № лота | Наименование | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|
| 3 | Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KRONE SDR 27, рег. знак А8527А-3, инв. № 5403 | 63 543,58 |
| 4 | Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KRONE SDR, рег. знак А9824А-3, инв. № 5538 | 65 473,84 |
| 5 | Прицеп специальный фургон-рефрижератор MAZ 837810 1012 KUPAVA 871100, рег. знак А3237А-3, инв. № 4246 | 23 675,39 |
| 6 | Прицеп специальный фургон-рефрижератор MAZ 837810 1012 KUPAVA 871100, рег. знак А3520А-3, инв. № 4278 | 19 537,13 |
| 7 | Прицеп специальный фургон-рефрижератор MAZ 97585 KUPAVA 930011, рег. знак А2653В-3, инв. № 5920 | 7 704,00 |
| 8 | Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KUPAVA 9300 W0, рег. знак А5725А-3, инв. № 5004 | 43 386,86 |
| 9 | Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KUPAVA 9300 W0, рег. знак А5007А-3, инв. № 4907 | 42 314,53 |
| 10 | Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KUPAVA 9300 W0, рег. знак А5281А-3, инв. № 4972 | 34 848,00 |
| 11 | Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KUPAVA 9300 W0, рег. знак А5211А-3, инв. № 4919 | 50 910,92 |
| 12 | Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KUPAVA 9300 W0, рег. знак А3222А-3, инв. № 4241 | 34 872,76 |
| 13 | Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KUPAVA 9300 W0, рег. знак А3221А-3, инв. № 4239 | 34 863,94 |
| 14 | Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор KUPAVA 9300 W0, рег. знак А7328А-3, инв. № 5237 | 54 995,84 |
| 15 | Грузовой специальный фургон изотермический MAZ 6303 А5 341 KUPAVA 673100, рег. знак А1 9402-3, инв. № 4247 | 16 477,21 |
| 16 | Грузовой специальный фургон изотермический MAZ 6303 А5 341 KUPAVA 673100, рег. знак АК 6641-3, инв. № 4245 | 13 717,07 |
| 17 | Упаковочная машина PK 91SP для упаковки вязких продуктов в пакет «Дойпак» с угловым штуцером (2008/014/P044), инв. № 4296 | 94 464,90 |
| 18 | Упаковочный автомат Trepko PMG-2, инв. № 4082 (бывшее в употреблении оборудование) | 162 157,67 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 15 (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда»: лоты №№ 1, 2, 18 – 10.01.2020, лоты №№ 3–17 – 07.02.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов 25.03.2020 в 11.00. Окончание торгов 25.03.2020 в 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов** |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.03.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

SEX=БАЛЯСЫ

# СТЭЙК ДЛЯ ДАМ

**Нядаўна ў сеціве грымнуў не які-небудзь, а кулінарна-фемініцкі скандал! («— Каханая, я не меў рацыі. Давай памірымся. — Добра. Пачакай, не еш. Я прыгатую штосьці іншае».) Усё адбылося пасля таго, як гастраблогер Вікі Эндрус выклала ў «Твітэры» меню невялікага сямейнага рэстарана ў Ліверпулі. Жах, у пераліку страў адным з пунктаў фігураваў... «стэйк для дам»! Мала таго што адна назва ўжо звяртала на сябе ўвагу, дык ён яшчэ памерам (а гэта ўжо жах жахлівы) быў меншы, чым астатнія стравы гэтай жа катэгорыі! Уяўляеце, што тут пачалося? Панесліся каментары кшталту «На дварэ 2020-ы, а не 1920-ы!», маўляў, жанчыны таксама ядуць вялікія стэйкі...**

Прабачце, а што адбылося, што тут не так? Не сакрэт, што сярэднестатыстычнаму мужчыну трэба мяса больш, чым такой жа сярэднестатыстычнай жанчыне. Так было і сто гадоў таму, і дзвесце, калі, каб атрымаць той самы стэйк, трэба было спачатку дагнаць бізона. Ды і цяпер на адных аладках з кабачкоў цэлы дзень не пакосіш, не пасячэш дровы, не пакапаеш. («— Каб ты ведаў, як я сёння стамілася: набегайся за дзень, а потым яшчэ гэты секс... — Што, дагналі?») Пагадзіцеся, рэдкая прадстаўніца прыгожага полу выконвае цяпер такую фізічную работу. Канешне, выключэнні ёсць, ніхто не спрачаецца!

Напрыклад, у Фінляндыі задумаліся над увядзеннем вайсковага прызыву для жанчын, бо кожны трэці малады чалавек у гэтай краіне не праходзіць ваенной службы. («Я зразумеў, чаму няма жанчын — ваенных стратэгаў-камандуючых. Таму што сабраліся дзве арміі на бітву, а яна ўстае ранкам і кажа: «Давайце не сёння, у мяне галава баліць!») Саюз рэзервістаў падтрымлівае прапанову. Кажуць, што ў Фінляндыі шмат жанчын, якія маглі б стаць выдатнымі салдатамі. («Вольга хоць і прамахнулася ў ціры, але і забраць мішку ёй ужо ніхто не перашкодзіў...») Каб такі вайсковец быў не толькі прыгожы, але і дужы, вытрымліваў нагрузкі, сапраўды, без добрага стэйка не абысціся.



Зрэшты, хоць у Ізраілі ў армію прызываюцца ў абавязковым парадку і жанчыны, служыць у танкавых войсках ім забараняюць ужо некалькі апошніх гадоў. А ведаеце чаму? (Жарт, які павінны ведаць мужчыны. «На абрамканскім «Абрамсе» адсутнічае аўтамат зараджання, таму абавязковы пяты член экіпажа — здаровы і дужы цемнаскуры танкіст».) Гэта я да таго, што танкавы снарад — не пярынка. Цяпер уявіце, што ў абмежаванай прасторы яго трэба дастаць з боеўкладкі і даслаць у казённік пушкі. А калі камандзір аддае загад: «Пяць снарадаў! Беглы — агонь!» Гэта відавочна цягне на добры стэйк напярэдадні.

Ёсць і яшчэ адна праблема. Жаночая служба ў бронетанкавым корпусе выклікала рэзкую крытыку з боку шэрагу высокапастаўленых афіцэраў і рэлігійных дзеячаў. Як сцвярджаў ранейшы галоўны рабін Арміі абароны Ізраіля Ісраэль Вайс, калі салдат жаночага і мужчынскага полу памясціць «у закрытую каробку на тыдзень, дык праз дзевяць месяцаў вы атрымаеце маленькага танкіста». («Выходзіць фея з лесу і бачыць, як па палянцы экіпаж рамантуе танк — нацягвае гусеніцу. «А што гэта вы, хлопчыкі, робіце?» — пытаецца. «Што, не бачыш, сексам займаемся», — з'едліва адказваюць ёй стомленыя вайскоўцы. «Дык можа вы па-сапраўднаму хочаце?» — «А тое!» — вочы заблішчэлі, інструменты з рук павыляталі... Фея ўзмахнула чароўнай палачкай, і — бац! — у танка... адвалілася вежа...») Тут таксама спатрэбіцца ўзмоцненае харчаванне, толькі ўжо з другой нагоды... Так што ізраільская «Меркавы» пакуль застаюцца без дамскіх ручак.

...Дарэчы, уладальнік рэстарана ўвогуле не ведаў пра гэтую гісторыю са стэйкам, яму яе паведамілі журналісты брытанскага Metro. Справа ў тым, што страва значыцца ў меню ўжо пяць гадоў і карыстаецца вялікай папулярнасцю (спытайце, у каго?) у дзяўчат! Па словах рэстаратара, Ladies Fillet у яго ўстанове — адна з тых пазіцый, якую найчасцей замаўляюць у прынцыпе. Таму ён нічога мяняць не збіраецца. І правільна. Усё проста — меру ведаць трэба. Не працуеш як чорны вол — памятай пра лішнія калорыі.

Так, 30-гадовая амерыканка Джэймі Лопес выправілася ў салон прыгажосці, але яе паход скончыўся няўдачай. Не паспела дама ўладкавацца ў крэсле, як тое пад яе вагой... развалілася на дзве часткі. Пасля яна часта атрымлівала адмовы ў салонах з-за сваіх габарытаў: пад кліентку проста немагчыма было знайсці трывалую мэблю. («Вырашыла пахудзець і папрасіла сваіх хатніх мяне маральна падтрымаць у гэтым. Прыйшла ўвечары дадому і ўбачыла на халадзільніку запіску: «Тлустая дачка — ганьба для сям'і!».) Праўда, амерыканка ўсё ж знайшла выйсце з сітуацыі. Яна назбірала грошай і адкрыла ў Лас-Вегасе першы ў Амерыцы салон прыгажосці, уваход у які худым дзяўчатам забаронены. Лопес сцвярджае, што ўся мэбля ў ім была спецыяльна сканструявана для дам «у целе». Крэслы, канапы вытрымаюць нават 300-кілаграмовых кліентак. А можа, прасцей было заказваць стэйк для дам?! («— Жанчына, гэтая сукенка вас поўніць! — Ну дзякуй богу, бо я на чабурэкі грашыла».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Нашы апетыты растуць»

**(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)**

***— Ваш шлях у Вышэйшую лігу аказаўся надзвычай кароткі, асабліва калі ўлічыць, што каманда была ўтворана толькі ў 2017 годзе. Хто, дарэчы, быў ініцыятарам?***

**АЛІНА:** — «Дзеці Цьюрынга» выраслі са студэнцкіх капуснікаў. У Беларускім дзяржаўным універсітэце ёсць традыцыя: першакурснікі павінны зладзіць свой. Іх задача — напісаць штосьці смешнае пад кіраўніцтвам сваіх куратараў, студэнтаў больш старшых курсаў. Вось так мы ўсе і пазнаёміліся. Андрэй Шляхаў быў куратарам ва Улада Дзейкуна, Улад з Ягорам Тоўсцікам — куратарамі ў Марка, Улад быў куратарам таксама і ў мяне. Мы перазнаёміліся, усё гэта збіралася як снежны ком: у нашай камандзе ёсць прадстаўнікі розных курсаў ФПМІ, магістратуры і выпускнікі факультэта.



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**МАРК:** — Яе склад практычна не змяняўся з моманту ўтварэння. Я гуляў у КВЗ са сваёй аднакласніцай Арынай Сцепанцовай яшчэ ў школе. Калі мы паступілі ва ўніверсітэт, то вырашылі, што трэба сабраць каманду і пагуляць у КВЗ ужо тут. Я паклікаў тых, з кім ладзіў капуснік. Аліну, напрыклад, запрасіў у каманду, каб яна спявала, бо ўмее гэта рабіць. Бессэнсоўны набытак (*смяецца*. — **Аўт.**), бо пазней высветлілася, што спяваць мы не будзем...

***— Жартаваць адно з адным — гэта традыцыя?***

**МАРК:** — Калі б Аліна ўмела жартаваць, то гэта была б, напэўна, традыцыя (*зноў смяецца*)... А калі сур'ёзна, то ўсе жарты мы ствараем разам. У КВЗ ёсць каманды — «галовы», якія гавораць: выступаюць на сцэне, а ўсе тэксты для іх пішуць аўтары. А мы не толькі выходзім на сцэну, але і самі пішам, а потым гэта паказваем. У нас няма рэжысёраў, ёсць толькі гукарэжысёр, які адказвае за ўсю музычную частку, відэарад, карацей, за ўсе медыя падчас нашага выступлення. Прычым у конкурсе «Разминка» ён выходзіць нам на дапамогу. На сцэне прадстаўлены шэсць чалавек, і столькі ж працуюць на агульны поспех за ёй: шукаюць рэквізіт, вырашаюць арганізацыйныя пытанні. Мы вельмі кампактная каманда. Так, нам пашчасціла трапіць у Вышэйшую лігу КВЗ, не выступіўшы ні ў Прэм'ер-лізе, ні ў Першай... У 2019 годзе мы сталі чэмпіёнамі Лігі Масквы і Падмаскоўя і ўладальнікамі кубка Адкрытай лігі КВЗ БДУ. А ў Вышэйшую лігу адабраліся па выніках фестывалю ў Сочы, дзе бралі ўдзел 457 зборных.

***— На першай гульні ў Вышэйшай лізе вы ўпэўнена заявілі: «БДУ вяртаецца». Але за апошнія дваццаць гадоў КВЗ вельмі моцна змяніўся. І калі раней дастаткова было проста добра жартаваць, то цяпер большасць камандаў ладзяць на сцэне тэатралізаванае шоу з вялікай масоўкай і багатым рэквізітам, запрашаюць «зорак» і нават цэлыя харавыя калектывы. Як вы збіраецеся ім супрацьстаяць? І чый стыль вам найбольш блізкі?***

**МАРК:** — Я лічу, што ў КВЗ па-ранейшаму дастаткова проста якасна жартаваць. Доказ таму — поспех у гульні каманды «ДАЛС» («Дэтэктыўнае агенцтва «Лунное святло»), дзе на сцэне былі ўсяго два чалавекі. Без усялякіх шоу выступалі таксама «Барцы», «Камызякі», «Кефір» і тая ж «Руская дарога», якая размахнулася з хорам толькі ў сваім апошнім фінале. І ўсё ж такі КВЗ моцна змяніўся. Цяпер вельмі высокая шчыльнасць гумару — трэба выдаваць жарт кожныя дзесяць секунд. На сцэне ўсе размаўляюць жартамі. Так, у КВЗ няма эпатажу, ніхто не здзекуецца з гасцей у студыі, але гэта раней ён быў аазісам гумару, а зараз у яго з'явілася шмат канкурэнтаў у тэлеэфіры.

***— Ад беларускай каманды ўсе чакаюць жартаў пра Беларусь. Як доўга можна эксплуатаваць гэту тэму, каб заставацца цікавым гледачу?***

**МАРК:** — Канешне, нельга бясконца жартаваць над тым, што беларусы — самыя ўплывовыя людзі ў свеце. Але ж ніхто не сумняваецца, што мы прыехалі з Беларусі, і калі ў цябе ёсць свой, невыдуманы бэкграунд, то, хутчэй за ўсё, на гэтым можна ехаць доўга. Але мы ніколі не будзем жартаваць са злосцю, бо мы любім сваю краіну і дрэнны жарт пра Беларусь нас абражае. Мы жартавалі ў музычным фрыстайле пра тое, што ўсе заўтра прачнёмся ў адной вялікай Беларусі, але ёсць палітычныя пытанні, якія датычацца нашай незалежнасці, і мы насамрэч не збіраемся аб'ядноўвацца з Расіяй. І выходзіць на сцэну і казаць, як гэта будзе добра, мы таксама не будзем.

***— Любой гульні папярэднічаюць прагляды рэдактараў. Скажыце, ці моцна пацярпеў матэрыял, з якім вы прыехалі заваёўваць Вышэйшую лігу?***

**МАРК:** — Першапачаткова наш музычны конкурс быў прысвечаны толькі аб'яднанню Беларусі і Расіі, і там не было другога блока пра далучэнне да Беларусі ўсіх краін свету. Аляксандр Васільевіч Масляков сказаў, што ў сярэдзіне нумара пачынаеш верыць, нібыта ўсё так і ёсць, і калі чалавек будзе блукаць па каналах і трапіць на сярэдзіну гэтага нашага выступлення, то ён не зразумее, што адбываецца. Таму мы дапісвалі ўжо ў Маскве палову нашага музычнага нумара. А ў «візітоўцы» нічога змяняць не давялося.

***— «Галусцян, Харацьян — гэтыя беларусы ўсе на адзін твар», — жартавалі вы. Пра склад журы вам паведамляюць загадзя?***

**МАРК:** — Прысутнасць Харацьяна была пад пытаннем, нам дакладна паведамілі, што ён будзе, прыкладна за дзень да гульні, таму гэты жарт з'явіўся ў фрыстайле літаральна ў апошні момант. На жаль, тэлеэфір не передае таго, што адбывалася ў зале. Былі моманты, калі я сам сябе не чуў: літаральна крычаў тэкст, але не чуў. А жарт «Аляксандр Васільевіч, прабачце, але цяпер быць прэзідэнтам і паўсюль вазіць свайго сына — ужо не ваша фішка» ніхто ў зале не пачуў, таму што працягвалі смяяцца з папярэдняга жарту.

***— Пасля вашага першага выступлення інтэрнэт літаральна выбухнуў. Адны пішуць «Брава, дзеці! Але толькі давайце і ў наступнай чвэрці атрымайце адны пяцёркі! Апантана хочацца працягу!» Але ёсць і скептыкі, якія кажуць, што шмат з таго матэрыялу, з якім вы перамаглі, раней дэманстравалася ў Лізе Масквы і Падмаскоўя...***

**МАРК:** — Менавіта таму ўсе каманды ідуць да Вышэйшай лігі так доўга, каб потым паказаць там найлепшае са створанага. А па якіх крытэрыях адбіраць у «вышку»? Калі ты ўжо напісаў штосьці годнае, што заслугоўвае ўвагі, значыць, можаш напісаць штосьці яшчэ. Абсалютна ўсе навічкі Вышэйшай лігі выкарыстоўваюць найлепшае з таго, што ў іх ужо было раней.

***— Але вы ўзнялі такую планку, што самі максімальна ўскладнілі сабе задачу на будучыню. Ці зможаце вы паўтарыць свой поспех? Гэта пытанне хвалюе ўсіх...***

**МАРК:** — Задачу-мінімум мы выканалі — трапілі ў «вышку». Хоць яшчэ год таму ў нас была больш сціплая задача — за два гады трапіць у «прэм'ерку». Калі ехалі на фестываль у Сочы, вельмі хацелі туды адабрацца, але потым нашы апетыты пачалі расці. Ужо пасля першага выступлення замахнуліся на «вышку». Зараз наша задача — дайсці да паўфіналу. Галоўнае — прайсці адну чацвёртую, абараніць дыплом, а там ужо летам будзе больш часу для прыдумвання новых ходаў і жартаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Поўны тэкст інтэрв'ю і больш фота на сайце zviazda.by**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 11.03.2020 г.

# ВЯРТАННЕ ДА ЖЫЦЦЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А гэта ён, той самы пінчук Дзіма, што займаўся спортам, рос на радасць бацькам, вучыўся пасля дзевяці класаў у індустрыяльна-педагагічным тэхнікуме, але скончыць яго не паспеў з названай вышэй прычыны. Тая злашчасная доза атруты, на якую ўпершыню спакусіўся падлеткам, стала мяжой у яго жыцці, якую пераадолець было вельмі цяжка. Пасля аднаго зняволення адбылося другое, як ён скажа пазней: «Калоніі мяняліся, не мяняўся светапогляд. Вось уявіце сабе. Выйшаў з турмы, прыехаў дадому. Ранкам выглядваеш у акно: людзі спяшаюцца на работу, некаторыя вядуць дзяцей у садок, праводзяць большых у школу. Ва ўсіх неадкладныя справы, распісаны час. А табе нікуды не трэба! І вось гэта, мусіць, самае страшнае. У нейкі момант разумееш, што ёсць два шляхі. Першы з іх прывядзе назад у звыклы крымінальны асяродак. Другі — гэта пастарацца змяніць сваё жыццё. Апошні шлях нашмат цяжэйшы, прыступкі на ім крохкія, могуць развальвацца і літаральна раставаць пад кожным тваім крокам. Тут галоўнае, каб былі побач людзі, якія могуць падказаць, накіраваць, дапамагчы».

**«Мы нікога не трымаем сілай. Чалавек заўсёды можа сабраць свае рэчы і пайсці. Гэта месца добраахвотнага знаходжання — апошняе служыць стымулам і галоўным стрымліваючым фактарам».**

Такіх людзей Дзмітрый сустрэў у цэнтры рэабілітацыі дабрачыннай рэлігійнай місіі ў Мінску ў раёне Чыжоўкі. Гэты цэнтр толькі адкрываўся. Дзмітрый быў у ім чацвёртым студэнтам. Менавіта так называюць тут рэабілітантаў — не пацыентамі, напрыклад, а студэнтамі, падкрэсліваючы, што людзі вучацца жыць па-новаму, спасцігаюць новае жыццё.

## Зноў стаць сынам

— Вось прыехаў туды, — працягвае суразмоўца, — без зубоў, цяпер яны ўстаўныя, з мноствам дыягназаў, сам такі, што, здаецца, у пакет можна запхнуць, бо пасля спажывання наркотыкаў ад чалавека, можна сказаць, палова застаецца. Мне адразу даходліва растлумачылі, што правілы знаходжання жорсткія, усе свае ранейшыя звычкі трэба пакінуць за парогам і паспрабаваць навучыцца жыць па-новаму з іншымі каштоўнасцямі і прыярытэтамі. І тут узнікла яшчэ адна праблема. На момант паступлення ў цэнтр на мяне быў складзены пратакол за правапарушэнне і заведзена крымінальная справа. Для звычайнага чалавека гэта можа скончыцца прафілактычнай гутаркай, ушчуваннем, а для таго, хто ўжо мае судзімасць, як у маім выпадку, магло б абярнуцца новым тэрмінам зняволення. Усё вісела на валаску, але цэнтр пахадайнічаў за мяне і ў міліцыі пайшлі насустрач. Усё жыццё буду ўдзячны тым людзям у пагонах, якія паверылі, далі апошні шанс. Але найперш удзячны Богу, што так распарадзіўся, бо калі б я адтуль пайшоў зноў за краты, наўрад ці што было б добрага ў маім жыцці наогул.



Дырэктар Алег ЛЯХОВІЧ дэманструе гіпсавую плітку ў майстэрні.

— Магу сказаць, — працягвае Дзмітрый, — што з цэнтра рэабілітацыі я выйшаў не проста іншым, я выйшаў зусім другім чалавекам. Нібы той ранейшы недзе там застаўся, а новы прыйшоў у гэты свет. Не скажу, што гэта было лёгка. Некаму можа здацца, што ў адзін дзень ці адно імгненне прасвятлела ў мазгах і ты стаў іншы. Не, так не бывае. Гэта даецца вялікай працай, душэўнай, фізічнай, вялікімі высілкамі над сабой. Трэба вучыцца пакорлівасці, разуменню, вучыцца думаць, вучыцца выказваць свае думкі. Усё гэта — складаная навука.

Аднойчы ў цэнтры за слова «ў натуры» я атрымаў дзве гадзіны штрафных работ. Гэта ж не брыдкае, не абразлівае слова, але сутнасць заключалася ў тым, каб адвыкнуць, выкінуць з ужытку турэмны жаргон наогул. Памятаю, як тыя дзве гадзіны палоў часнок, аж слёзы на вачах выступалі. Цяпер разумею, што так вучыўся пакорлівасці. Бо раней жа як было: табе сказалі слова, а ты — пятнаццаць у адказ, ды якіх! Усё гэта трэба было прайсці, каб прыйсці да Бога. Бо без веры, паводле майго пераканання, сам з такім грузам не справіўся, — разважае Дзмітрый Марціноўскі.



Два гады таму ён ажаніўся. Жыццё яго пінскай сям'і, відома, стала іншае. «Я зразумеў, што для сваіх бацькоў нібы наноў стаў сынам, — кажа дарослы чалавек. — Калі мы збіраемся ўсе, бацькі радуюцца, мы разам адзначаем сямейныя падзеі, святы. Прыязджае сястра з сям'ёй, яна выкладае замежную мову ў школе, у яе добры муж, дзеці. І я цяпер прыязджаю з жонкай. Усё ў нас як мае быць, і гэта найвялікшае шчасце для бацькоў».

Зараз Дзмітрый працуе намеснікам дырэктара цэнтра рэабілітацыі, які размешчаны ў вёсцы Велікарыта, падпрацоўвае на будоўлі ў Брэсце.

## Дом у Велікарыце

Цэнтр — адна з устаноў дабрачыннай місіі «Вяртанне» Саюза хрысціян веры евангельскай у Беларусі. Цэнтр пад назвай «Краіна жывых» з'явіўся ў Велікарыце сем гадоў таму. Усе валанцёры і супрацоўнікі цэнтра самі раней праходзілі рэабілітацыю, мелі праблемы з наркотыкамі, алкаголем альбо былі асуджаныя. Кожны з іх такім чынам служыць жывым прыкладам для цяперашніх насельнікаў.

— Пачыналі з таго, што купілі вясковую хату ў Велікарыце, — расказвае **дырэктар цэнтра Алег ЛЯХОВІЧ.** — Яна, толькі адрамантаваная і крыху добраўпарадкаваная, і цяпер служыць жыллём для тых, што праходзяць трэці этап праграмы рэабілітацыі. А для асноўных студэнтаў мы пабудавалі новы корпус. Тут мужчыны жывуць чатыры месяцы, на другія восем месяцаў яны накіроўваюцца ў іншы цэнтр. А да нас прыбываюць на астатнія шэсць месяцаў адаптацыі тыя з іх, хто не захацеў пакінуць установу, а выказаў намер памяняць сваё жыццё і дасягнуў пэўных поспехаў. Відома, тут бываюць і выпадковыя людзі. Некаму проста трэба перазімаваць, калі больш няма куды пайсці. Іншыя не вытрымліваюць дысцыпліны і патрабаванняў, бо першапачаткова былі настроены на вольнае пражыванне накшталт інтэрната.

— Мы нікога не трымаем сілай, — працягвае суразмоўнік. — Чалавек заўсёды можа сабраць свае рэчы і пайсці. Гэта месца добраахвотнага знаходжання — апошняе служыць стымулам і галоўным стрымліваючым фактарам. Кандыдат пры паступленні знаёміцца з правіламі пражывання, мы даём пералік іх у пісьмовым выглядзе. Потым, калі пагаджаецца і прымае рашэнне, накіроўваем прайсці медыцынскую камісію. Важна, каб патэнцыйны студэнт зрабіў флюараграфію, аналізы крыві, прайшоў адпаведных спецыялістаў. Пасля гэтага кандыдат падрабязна знаёміцца з раскладам пражывання, правіламі, асаблівасцямі. Напрыклад, пры паступленні кожны праходзіць дагляд сябе і рэчаў, патэнцыяльны студэнт падпісвае згоду на вобыск. Важна, каб ён не прынёс з сабой цыгарэты, алкаголь, нейкія таблеткі. Гэта выключаецца катэгарычна. Інакш якая рэабілітацыя?!

## Працоўная тэрапія

Распарадак тут даволі строгі. Пад'ём у сем раніцы, адбой у адзінаццаць вечара. Мабільныя тэлефоны забаронены, пагаварыць з роднымі можна раз на тыдзень, на тэлефонны званок адводзіцца 5-10 хвілін. Асноўны акцэнт робіцца на працатэрапію. З ранку да абеду насельнікі цэнтра працуюць у падсобнай гаспадарцы, дапамагаюць мясцовым жыхарам. Літаральна на мінулым тыдні вясковая бабулька папрасіла разабраць хлеў, а потым ніяк не магла ўцяміць, чаму гэтыя хлопцы адмаўляюцца грошы ўзяць за работу. Але ж ёй толькі пажадалі здароўя ды пайшлі да сябе — трэба было спяшацца на заняткі, якія тут праходзяць у другой палове дня. **Старшыня Велікарыцкага сельскага Савета Віктар КІРЫЧУН** расказаў, што сельскую бібліятэку ў Пажэжыне валанцёры цэнтра адрамантавалі так, што зайсці прыемна. Паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, яны заўсёды прыходзяць на дапамогу, варта толькі звярнуцца.

**«Некаму можа здацца, што ў адзін дзень ці адно імгненне прасвятлела ў мазгах і ты стаў іншы. Не, так не бывае. Гэта даецца вялікай працай, душэўнай, фізічнай, вялікімі высілкамі над сабой. Трэба вучыцца пакорлівасці, разуменню, вучыцца думаць, вучыцца выказваць свае думкі. Усё гэта — складаная навука».**

Пастаяльцы шмат працуюць на сваёй падсобнай гаспадарцы. У цяпліцы вырошчваюць агуркі, іншую агародніну, у хляве ёсць свойская жывёла. Дарэчы, агуркі прадаюць у сезон насельніцтву па цане, ніжэйшай за рыначную.

Побач з жылым узвялі яшчэ адзін корпус. Пакуль у ім часова размясцілі майстэрню, дзе вырабляецца плітка з гіпсу. Далей, расказалі, ёсць планы пераабсталяваць будынак пад жылы і адкрыць цэнтр рэабілітацыі для жанчын. Такіх, што маюць у гэтым патрэбу, на жаль, у нашым грамадстве таксама нямала.

## Работа над сабой

Нават павярхоўнага знаёмства з жыццём і побытам цэнтра дастаткова, каб разумець, як тут няпроста жыць і якое жаданне перабудаваць сябе павінна кіраваць чалавекам, каб ён усвядоміў неабходнасць і вырашыў прайсці гэты шлях. Для многіх заняткі па вывучэнні Святога Пісання становяцца сапраўдным выпрабаваннем. Як і работа для іншых.

— Наркаманы цэлы дзень вучыліся б, кніжкі чыталі, — кажа Алег Ляховіч. — Алкаголікі, наадварот, лепш бы зранку да вечара лапатай махалі. А тут трэба і адно, і другое. А калі распарадак некага не задавальняе і ён пачынае абурацца, бубніць, мы можам сцярпець раз альбо другі. Пасля трэцяга разу чалавек збірае свае рэчы і пакідае ўстанову. Добраахвотнасць знаходжання і падпарадкаванне правілам — залог і перадумова поспеху. Гэта ўсяляк тлумачым пры паступленні.

Вынікі такіх намаганняў сведчаць самі за сябе. Цёзка Дзмітрыя Марціноўскага — таксама Дзіма, таксама пінчук, паспеў яшчэ скончыць банкаўскі каледж, а потым — дзесяць гадоў зняволення. Прайшоў праз цэнтр, цяпер супрацоўнік брэсцкага гандлёвага цэнтра «Мацярык», там жа працуе яшчэ адзін «выпускнік» — Раман. Цэнтр, дарэчы, дапамагае працаўладкавацца тым, хто паспяхова праходзіць рэабілітацыю і дэманструе жаданне пачаць новае жыццё.

У кожнага тут у асабістым архіве душы свая гісторыя колаў пекла. Прайшлі рэабілітацыю, напрыклад, тры браты з агурочнай сталіцы Палесся — Альшан. Паводле слоў работнікаў цэнтра, там наогул была цяжкая сітуацыя. Хлопцы не ўмелі чытаць і пісаць, шэраг сацыяльных навыкаў быў страчаны, нібы ў джунглях выраслі. Але ж прайшлі навучанне, здолелі паглядзець на свет іншымі вачыма і цяпер маюць сем'і, вырошчваюць агуркі ў Альшанах, а ў сезон дапамагаюць цэнтру з насеннем. Дарэчы, многія, хто прайшоў рэабілітацыю, прыязджаюць сюды ў выхадныя з сем'ямі на сваіх машынах, тым самым становяцца найлепшым вучэбным дапаможнікам цяперашнім студэнтам: маўляў, глядзіце, і ў вас можа быць нармальнае чалавечае жыццё з яго радасцямі, з пэўным дастаткам, з работай, сям'ёй.

